САКАВІК
11
ПАНЯДЗЕЛАК
1940 год
№ 8 (464)
ЦАНА 20 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

50-годдзе Вячэслава Міхайлавіча Молатава

ВЫДАТНЫ ДЗЕЯЧ БОЛЬШЭВІЦКАЙ ПАРТЫІ

Совецкі народ урачыста частвуе главу ўрада сваёй вялікай краіны, вернага саратніка Леніна і Сталіна, аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў большэвіцкай партыі — Вячэслава Міхайлавіча Молатава, адзначаючы яго юбілей — 50-годдзе з дня нараджэння.

Жыццёвы шлях Вячэслава Міхайлавіча — гэта слаўны шлях аддалага сына народа, мужнага байца партыі Леніна — Сталіна.

У грозныя дні рэвалюцыйнага 1905 года пятнаццацігадовым юнаком Вячаслаў Міхайлавіч прымкнуў да рэвалюцыйнага руху і назаўсёды звязаў сваё жыццё з барацьбой за шчасце народа, з большэвіцкай партыяй.

Пачаўшы з арганізацыі рэвалюцыйных сіл моладзі ў Казані, пазней, у Пецярбургу, Вячаслаў Міхайлавіч вырастае ў буйнейшага рэвалюцыянера-большэвіка. Разам з Леніным і Сталіным ён арганізоўвае і загартоўвае большэвіцкія рады, ў цяжкіх умовах рэакцыі, у падполлі, збірае рэвалюцыйныя сілы для новага штурму царызма.

Ні ссылкі, ні турмы, ні праследаванні царскай паліцыі — нішто не магло зламаць волю, аслабіць кіпучую дзейнасць мужнага большэвіка.

У пачатку 1912 года таварыш Молатаў працуе ў большэвіцкай газеце «Звезда», а потым з'яўляецца адным з арганізатараў, кіраўнікоў і актыўнейшых супрацоўнікаў большэвіцкай «Правды».

Таварыш Молатаў уваходзіць у склад Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, які пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна кіраваў паўстаннем у дні Вялікага Кастрычніка. Пасля перамогі Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі таварыш Молатаў — актыўнейшы змагар за ўмацаванне совецкай улады, аднаўленне народнай гаспадаркі, за абарону заваёў Кастрычніка.

Старшыня Совета народнай гаспадаркі Паўночнай вобласці, упаўнаважаны партыі і совецкага ўрада ў Наваложжы, буйнейшы партыйны работнік, сакратар ЦК партыі... І ўжо дзесяць год, як Вячаслаў Міхайлавіч Молатаў — саратнік вялікага Сталіна, адзін з баявых кіраўнікоў большэвіцкай партыі і яе ленінска-сталінскага ЦК, любімец народа — узначальвае ўрад першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян, знаходзіцца на пасту старшыні Совета Народных Камісараў СССР, а з 1939 года — і наркома замежных спраў.

Уся дзейнасць Вячэслава Міхайлавіча — главы ўрада вялікай краіны соцыялізма, таленавіцейшага дзяржаўнага дзеяча, мудрага палітыка, выдатнага тэарэтыка марксізма-ленінізма — з'яўляецца ярчэйшым узорам аддалейшага служэння народу, барацьбы за справу Леніна—Сталіна.

«Я, — гаварыў Вячаслаў Міхайлавіч, — рос у большэвіцкай партыі, і звязан з ёю многімі гадамі нястомнай работы. У мяне, як у комуніста, няма і не можа быць большага жадання, чым быць на справе вучнем Леніна. Мне нядоўга давялося працаваць пад непасрэдным кіраўніцтвам Леніна, але для мяне, як комуніста, заўсёды было і застаецца галоўнай задачай — засваенне вучэння Маркса—Леніна і актыўны ўдзел у справе ўвасаблення ў жыццё марксісцка-ленінскага вучэння».

Гэтыя словы з надзвычайнай яскравасцю акрэсліваюць Вячэслава Міхайлавіча, як палітычнага дзеяча ленінска-сталінскага тыпу.

Совецкі ўрад і асабіста таварыш Молатаў нястомна клапоцяцца аб развіцці соцыялістычнай культуры — мастацтва, літаратуры. Найвялікшую ўвагу Вячэслава Міхайлавіча адчуваюць работнікі мастацтваў нашай рэспублікі зараз, рыхтуючыся да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Совецкім урадам створаны выдатныя ўмовы для творчай працы майстраў мастацтва і літаратуры.

Усё новыя і новыя перамогі комунізма ўпісвае ў гісторыю чалавецтва совецкі народ. Нястомна ўзрастае міжнародны аўтарытэт Совецкага Саюза, непрыступнасць граніц краіны соцыялізма, слава зброі магутнейшай у свеце Чырвонай Арміі. Вызвалены з-пад панскага прыгнёту нашы браты, з'едналы нашы народы — украінскі і беларускі — у адзінай сям'і пад палымнеючым над совецкай зямлёй сонцам Сталінскай Канстытуцыі. Гераічная Чырвоная Армія забяспечыла непрыступнасць горада Леніна, дапамагае фінляндскаму народу змятаць са сваёй зямлі банды найміаў падпальшчыкаў вайны — англа-французскага імперыялізма.

Усё гэта — бліскучыя перамогі совецкага ўрада і няўхільна праводзімай ім сталінскай палітыкі міру. І ва ўсіх гэтых гістарычных справах нашага народа выключная роля належыць Вячаславу Міхайлавічу Молатаву, які, кіруючыся ўказаннямі таварыша Сталіна, выражаючы волю ўсяго совецкага народа, нястомна клапоціцца аб умацаванні нашай соцыялістычнай дзяржавы.

Горача віншуе главу совецкага ўрада, свайго дэпутата ў соцыялістычны парламент і любімага друга — Вячэслава Міхайлавіча Молатава вялікі беларускі народ.

Няхай жыве совецкі ўрад і яго глава, друг і саратнік вялікага Сталіна — Вячаслаў Міхайлавіч Молатаў!

Няхай жыве вялікі правадыр большэвіцкай партыі і совецкага народа — таварыш Сталін!



В. М. Молатаў. Малюнак маст. П. Васільева.

ВЕРНАМУ САРАТНІКУ ЛЕНІНА І СТАЛІНА — ВЯЧЭСЛАВУ МІХАЙЛАВІЧУ МОЛАТАВУ

Цэнтральны Камітэт большэвіцкай партыі горача вітае цябе, вернага саратніка Леніна і Сталіна, кіраўніка Совецкага Ўрада — у дзень твайго пяцідзесяцігоддзя.

Усё сваё свядомае жыццё ты безупынна служыш справе рабочага класа, справе комунізма ў якасці выдатнага дзеяча і правадыра большэвіцкай партыі. У чорныя годы рэакцыі пасля паражэння рэвалюцыі 1905—1907 гг., у годы ўздыму рабочага руху, у эпоху «Звезды» і «Правды», у агні першай сусветнай імперыялістычнай вайны — ты заўсёды высока трымаў сцяг большэвізма, нястомна змагаючыся за дыктатуру пролетарыята ў нашай краіне. Як член Петраградскага Ваенна-Рэвалюцыйнага Камітэта, ты правёў вялікую рэвалюцыйна-большэвіцкую работу ў кастрычніку 1917 года. Сваёй работай у якасці кіраўніка партыйных арганізацый Данбаса, Украіны, Масквы, у якасці Сакратара ЦК ВКП(б), сваёй многагадовай слаўнай работай на пасту главы Совецкага Ўрада ты заслужыў гарачую любоў і велізарную павагу партыі і працоўных Совецкага Саюза.

Як адзін з віднейшых правадыроў большэвіцкай партыі, як буйнейшы арганізатар соцыялістычнай эканомікі і новай, комуністычнай культуры, ты ўвасобіў у сабе лепшыя якасці палітычнага дзеяча ленінска-сталінскага тыпу. Ты заўсёды вёў і вядзеш паслядоўную барацьбу за ідэі марксізма-ленінізма, няўхільна адстойваючы лінію партыі супроць ворагаў партыі і совецкага народа, супроць трацкістаў, зіноўеўцаў, бухарынцаў і іншых агентаў буржуазіі.

Тваёй энергіі, тваёй нястомнай рабоце на пасту Старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР краіна соцыялізма ва многім абавязана сваімі поспехамі і перамогамі. У сваіх вусных і друкаваных выступленнях перад партыяй і краінай ты абагульваеш гіганцкі вопыт вялікай работы па стварэнню комуністычнага грамадства.

Жадаем табе, наш дарагі друг і таварыш, ад усёй душы многіх, многіх год здароўя і далейшай плодатворнай работы на карысць нашай партыі, на карысць нашай радзімы, на карысць комунізма.

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў).

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч!

Цэнтральны Камітэт Комуністычнай партыі большэвікоў Беларусі і Совет Народных Камісараў БССР шлюць Вам, вернаму сыну большэвіцкай партыі, главе Совецкага ўрада, бліжэйшаму саратніку вялікага Сталіна ў дзень Вашага слаўнага пяцідзесяцігоддзя гарачае большэвіцкае прывітанне.

Усё Ваша жыццё і дзейнасць неразрыўна звязаны з дзейнасцю найвялікшых правадыроў пролетарыята Леніна і Сталіна.

У суровыя годы падполля, у барацьбе за перамогу Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі, у грамадзянскай вайне, у барацьбе з ворагамі народа, з ворагамі соцыялізма, у барацьбе за пабудову і ўмацаванне соцыялістычнага грамадства, — Вы нязменна адстойвалі і беззаветна змагаліся за вялікую справу партыі Леніна—Сталіна.

З Вашым іменем звязаны найвялікшыя перамогі соцыялізма ў нашай краіне. Разам з вялікім Сталіным Вы арганізоўвалі і стварылі вялікае садружаства народаў — Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Верны вучань Леніна і бліжэйшы саратнік правадыра народаў таварыша Сталіна, — Вы з'яўляецеся буйнейшым арганізатарам і кіраўніком большэвіцкай партыі і совецкай улады.

Мудрая знешняя палітыка Совецкага Ўрада, майстэрска праводзімая Вамі, яшчэ вышэй узняла міжнародны аўтарытэт і значэнне Совецкага Саюза, расстроіла каварныя планы падпальшчыкаў вайны і забяспечыла мірную працу народаў СССР.

З іменем вялікага Сталіна, натхнёныя Вашым заклікам, часці нашай доблеснай Чырвонай Арміі бліскуча выканалі свой інтэрнацыянальны абавязак і вызвалілі 13 мільёнаў працоўных Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад гнёту польскіх памешчыкаў і капіталістаў.

Разам з таварышам Сталіным Вы штодзённа аказваеце беларускаму народу дапамогу ў будаўніцтве новага шчаслівага і радаснага жыцця. Беларусь, у мінулым адсталая, прыгнечаная калонія царызма, ператварылася ў квітнеючую, індустрыяльна-калгасную ордэнаносную соцыялістычную рэспубліку.

З'еднаны ў адзінай дзяржаве, беларускі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна ідзе ў першых радах за поўнай перамогі комунізма.

Жадаем Вам ад усёй душы, ад усяго сэрца многіх год жыцця і работы ва славу нашай вялікай радзімы, на карысць усіх працоўных, ва славу комунізма.

Няхай жыве Урад першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян і яго глава Вячаслаў Міхайлавіч Молатаў!

Няхай жыве наш правадыр, наш бацька, друг і настаўнік таварыш Сталін!

СОВЕТ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў) БЕЛАРУСІ.

ПРЫКЛАД БОЛЬШЭВІЦКАЙ ПАРТЫЙНАСЦІ

М. І. КАЛІНІН

Наша дарэвалюцыйная літаратура, у асобе яе лепшых прадстаўнікоў, старанна шукала шляхоў лепшага служэння народу. Але трэба сказаць, што нават вялікія рускія пісьменнікі, паколькі яны не выходзілі з сферы буржуазнага грамадства і яго светапогляду, не бачылі шляхоў, забяспечваючых перамогу народа над прыгняталынікамі, не бачылі і людзей, змагаючыхся за гэтыя шляхі.

Совецкая літаратура знаходзіцца куды ў лепшых умовах. Яна ўзбагачаецца тэорыяй марксізма-ленінізма, вопытам пролетарскай рэвалюцыі, практычным будаўніцтвам соцыялізма. Нарэшце, совецкае грамадства дае ёй магчымасць у мастацкай форме выяўляць з рэальнай рэчаіснасці станоўчых герояў для сваіх твораў. Поспехі совецкай літаратуры ў гэтых адносінах бясспрэчны. Аднак, мне здаецца, што для далейшага руху наперад у стварэнні больш складаных і абагуленых тыпаў змагароў за соцыялізм і яго будаўнікоў нашым мастакам неабходна больш глыбокае вывучэнне гісторыі партыі і яе дзеячоў.

Гэтыя мыслі міжволі прыходзяць у галаву ў сувязі з наступіўшым сёння пяцідзесяцігоддзем жыцця таварыша Молатава і больш чым трыццацігадовай яго работай у радах нашай партыі.

Не маючы магчымасці нават прыблізна і хоць-бы асобнымі штрыхамі накідаць усебаковую характарыстыку таварыша Молатава, я хачу адзначыць толькі адну яго рысу, якая, як мне здаецца, больш за ўсё кідаецца ў вочы.

Таварыш Молатаў уступіў у нашу партыю ў 1906 годзе, г. зн. тады, калі фактычна начаўся ўжо адліў першай рускай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Царскі ўрад, апрытомнеўшы ад першых удараў, пераходзіў у наступленне і граміў рэвалюцыю па частках у розных гарадах і раёнах краіны. Ліберальная буржуазія, напалоханая нябачаным размахам народнай рэвалюцыі не менш за самога цара, кінулася наперад да яго ў абдымкі. Яна была гатова заключыць з ім здзелку на базе любой «канстытуцыі». Сярод буржуазна-дэмакратычнай інтэлігенцыі ўсё больш распаўсюджваліся так званыя «вехаўскія» ідэі, г. зн. ідэі рэнегацтва, адмаўлення ад рэвалюцыі, г. зн. «абвяшчэнне сваіх «лівейных» пачуццяў (і ад павешнай «лівейнай» палітыкі) у адносінах да акцябрысцкай буржуазіі, у адносінах да старой улады, у адносінах да ўсёй старой Расіі наогул» (Ленін).

На глебе гэтых зрухаў ва ўсіх праслойках буржуазнага грамадства стала «модным» паліваць гразёю рэвалюцыю, праклінаць рэвалюцыйнае падполле і грамідць марксізм. І такія «модныя» настроі захапілі большую частку соцыял-дэмакратычнай інтэлігенцыі. Меншавікі лічылі, што рэвалюцыя скончылася, што нелегальную рэвалюцыйную партыю трэба ліквідзіраваць і павесці палітыку на базе адных толькі легальных арганізацый, прыстасоўваючыся да «падноўленага» самадзяржаўнага рэжыму, выпрошваючы альбо, правільней, вымольваючы ў цара расшырэння легальных магчымасцей. А частка былых большэвікоў, адкалоўшыяся ад большэвіцкай арганізацыі інтэлігенты, як Багданаў і іншыя, пачалі адкрыта рэвізаваць філасофскія асновы марксізма. Ленін у сваёй кнізе «Матэрыялізм і эмпірыёкрытыцызм» даў дастойны адказ усім рэвізіяністам і фальсіфікатарам марксізма.

Значыць, у той час, калі контррэволюцыя наступала, калі пачыналася рэакцыя, калі яна ўжо адчувала сябе пераможцам, — таварыш Молатаў уступіў у рады большэвікоў.

Працуючы спачатку сярод студэнцтва Казані, ён атрымаў першую высылку ў Волагду. У Волагдзе яго падпольная работа пачалася з арганізацыі групы большэвікоў. (Тут, між іншым, ён экстэрнам здаў экзамен на атэстат спеласці, што дало яму магчымасць пасля адбыцця ссылкі ў 1911 годзе паступіць у Пецярбургскі палітэхнічны інстытут).

Уся абстаноўка таго часу і самы пачатак партыйнай работы таварыша Молатава ясна паказвае, што яго ўступленне ў партыю не было рэзультатам захаплення юнацтва, а з'явілася зусім свядомым актам, які вызначыў усё яго наступнае жыццё і палітычную дзейнасць. Ён напэўна, калі можна так выразіцца, суправаджаў грамадскі шлях, выбраў самы трудны, самы цяжкі шлях свайго жыцця і дзейнасці. Маючы на шматлікіх прыкладах практычнага жыцця іншых рэвалюцыянераў, ды і па пачатку сваёй уласнай палітычнай дзейнасці, ён мог добра бачыць, што гэты шлях абяцае яму турмы, ссылкі і іншыя расправы рэакцыі.

Ён выбраў гэты шлях іменна таму, што па свайму глыбокаму перакананню лічыў яго найбольш сумленным, найбольш эфектыўным у справе служэння рабочаму класу, народу. І мы бачым, што ўся наступная дзейнасць таварыша Молатава падпарадкавана толькі гэтай мэце. Ён аддаўся ўвесь без астатку барацьбе, бязлітаснай барацьбе за ідэалы рабочага класа, а тым самым — за ўвесь прыгнечаны народ, за вызваленне працоўных ад усякага рабства і гнёту. А за гэта, як вядома, непасрэдна і прама, паслядоўна і да канца змагалася толькі адна партыя, партыя Леніна—Сталіна, партыя большэвікоў. Таму таварыш Молатаў і стаў верным байцом гэтай партыі.

Адбыўшы валагодскую ссылку, таварыш Молатаў пераехаў у Пецербург. Падпольная работа ў сталіцы была бліскучай школай для палітычных дзеячоў вялікага размаху. Вядома, што Пецербург быў цэнтрам рэвалюцыйнай барацьбы. Піцерскі пролетарыят быў найбольш арганізаваны, яго воля да барацьбы з царскім самадзяржаўем і капіталізмам была непахіснай. Пецербург меў і найбольш моцных працаўнікаў партыі большэвікоў. Я маю на ўвазе не толькі органы царскай аховы і паліцэйшчыны, але і грамадска-палітычныя арганізацыі ад чорнасоценцаў да анархістаў. Барацьба з гэтымі партыямі за ўплыў у рабочым асяроддзі вялася заўзятая.

У гэтым палітычным вадавароце правпаваў таварыш Молатаў. Тут ён загартоўваўся ў большэвіцкім кіраўніцтве: спачатку арганізацыя нелегальных студэнцкіх гурткоў і кіраўніцтва прапагандай у рабочых раёнах, потым супрацоўніцтва ў «Звезде», арганізацыя «Правды» і работа ў ёй у якасці адказнага сакратара яе рэдакцыі. «Праўдой» з-за граніцы кіраваў Ленін. Перапіска з ім не толькі давала кіруючыя ўказанні, але і ўзбагачала таварыша Молатава ў палітыцы.

У гэты перыяд у Пецербургу працаваў таварыш Сталін, які непасрэдна ўзначальваў «Праўду» ад ссылкі да ссылкі. Сустрэчы з ім, як з адным з вопытнейшых рэвалюцыянераў-большэвікоў і як з членам Цэнтральнага Камітэта партыі, непасрэдна служылі для таварыша Молатава надзвычайнай школай у практычнай рабоце і ў тэарэтычным засваенні марксізма-ленінізма.

Царская ахранка па дастоінству «ацаніла» работу таварыша Молатава. У красавіку 1913 года ён быў арыштаван і высылан з Пецербурга. Пасяліўшыся ў ваколіцах горада, таварыш Молатаў прадаўжаў актыўна працаваць у Пецербургскай арганізацыі і супрацоўнічаў у «Правде», абараняючы з неаслабнай энергіяй справу большэвізма. Хутка наследваў новы арышт, які, аднак, скончыўся спрыяюча, г. зн. за ім засталася старая высылка. У маі 1914 года зноў арышт, але цяпер ступень рэпрэсіі была ўзмоцнена. У пачатку сусветнай вайны таварыш Молатаў нелегальна вярнуўся ў Пецербург і адразу-ж уключыўся ў кіруючую партыйную работу, паслядоўна праводзячы ленінскую палітыку.

Шмат разоў царская ахранка выследжвала таварыша Молатава, арыштоўвала і высылала яго з Пецербурга, але ён зноў і зноў вяртаўся ў сталіцу, каб прадаўжаць партыйную работу. Нездарма паліцыя адзначала ў сваіх зводках, што «Скрабін акрэслены соцыял-дэмакрат, большэвік». А пецербургскія рабочыя, асабліва старэйшае пакаленне з пачуццём глыбокага задавальнення ўспамінаюць таварыша Молатава, як вернага салдата партыі, бязлітаснага да ўсіх ворагаў партыі і рабочага класа, стойкага і непрымірымага большэвіка-ленінца.

Затым нелегальная работа ў Маскве. Арышт. Ссылка ў Сібір. Чарговы пабег. Зварот у Петраград на партыйную работу.

Увосень 1916 года Цэнтральны Камітэт партыі кааптаваў таварыша Молатава ў Расійскае бюро ЦК, на якое выпала адказная задача непасрэдна і практычна кіраваць усімі арганізацыямі партыі, а праз іх — пролетарыятам краіны напярэдадні і ў часе Лютаўскай рэвалюцыі.

Падводзячы кароткі вынік грамадска-палітычнай дзейнасці таварыша Молатава за ўвесь перадрэвалюцыйны перыяд, мне хацелася-б адзначыць перш за ўсё і асабліва яе глыбокую ідэйнасць, рэволюцыйна-марксісцкую паслядоўнасць, няўхільнае правядзенне на практыцы ленінскай лініі, мэтанакіраванасць у барацьбе за комунізм, карацей гаворачы, — партыйнасць у самым высокім сэнсе гэтага слова. А гэту якасць я лічу самай галоўнай, самай каштоўнай якасцю рэволюцыянера. І трэба сказаць, што гэта якасць пакінула глыбокі след на ўсёй барацьбе нашай партыі ў дарэволюцыйны перыяд. Такія людзі могуць з гордасцю сказаць: мы не без поспеху ваявалі з царызмам, расчышчаючы шлях да ажыццяўлення канчатковай мэты рабочага класа.

У бурныя дні напярэдадні Кастрычніка мы бачым таварыша Молатава ў кіраўніцтве падрыхтоўкай і правядзеннем узброенага паўстання ў якасці аднаго з асноўных кіраўнікоў Петраградскага Совета і члена Ваенна-рэволюцыйнага камітэта.

Ледзь толькі завяршылася перамогай Кастрычніцкае ўзброенае паўстанне, партыя і совецкая ўлада ўзяліся за барацьбу з разрухай. Трэба было хоць-бы мінімальна забяспечыць функцыяніраванне прамысловасці, каб замацаваць перамогу. І таварыш Молатаў вылучаецца старшынёй Совета Народнай Гаспадаркі Паўночнага раёна, г. зн. цэлай групы губерній, прымыкаючых да Петраградскай. Тут ён пачаў непасрэдна кіраваць соцыялістычным будаўніцтвам, практычна ажыццяўляючы рабочы кантроль і праводзячы нацыяналізацыю прамысловасці. Пад яго кіраўніцтвам рабочыя праходзілі, так сказаць, школу падрыхтоўкі да кіравання прамысловасцю.

У годы грамадзянскай вайны таварыш Молатаў працаваў на важнейшых участках партыйнага і совецкага будаўніцтва, умацоўваючы дыктатуру пролетарыята.

На X з'ездзе партыі таварыш Молатаў быў выбран членам ЦК. Ён працуе сакратаром ЦК.

Амаль дзесяць год працаваў таварыш Молатаў сакратаром ЦК партыі. Пісаць аб яго дзейнасці ў гэты перыяд — гэта значыць пісаць гісторыю будаўніцтва нашай краіны, гісторыю ўмацавання совецкай улады, гісторыю жорсткай барацьбы з усімі ворагамі комуністычнай партыі, у тым ліку з рознымі здраднікамі і прадацелямі ўнутры партыі. Лепшым паказальнікам эфектыўнасці гэтай работы з'яўляюцца ўсім вядомыя поспехі як у галіне соцыялістычнага будаўніцтва, так і ў справе ўмацавання адзінства партыі.

Пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна таварыш Молатаў ва ўсёй сваёй дзейнасці, як член ЦК і Палітбюро, як сакратар ЦК высока трымаў сцяг марксізма-ленінізма. Ён быў непахісным правадніком у жыццё ідэй і ўказанняў Леніна і Сталіна. А гэта па сутнасці ёсць найлепшае, максімальна карыснае служэнне совецкаму народу і партыі.

З снежня 1930 года таварыш Молатаў — старшыня Соўнаркома СССР. Прыступаючы да работы ў якасці главы совецкага ўрада, ён так акрэсліў сваю задачу: «Дагэтуль мне прыходзілася працаваць, галоўным чынам, у якасці партыйнага работніка. Заяўляю вам, таварышы, і на работу ў Соўнарком я іду ў якасці партыйнага работніка, у якасці праваднікa волі партыі і яе Цэнтральнага Камітэта».

Кожнаму, хто блізка ведае таварыша Молатава, зразумела, што гэту заяву ён зрабіў не для краснага слоўца. Мысль, укладзеная ў гэту заяву, выражае яго ўнутраную сутнасць. Таварыш Молатаў і партыя неадлучны.

Амаль за дзесяцігадовы перыяд работы на пасту Старшыні Соўнаркома таварыш Молатаў паслядоўна і няўхільна праводзіў ленінска-сталінскую палітыку, па-партыйнаму, па-большэвіцку накіроўваючы совецкую работу. Можна перабраць усе рашэнні, прынятыя па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам таварыша Молатава, усе яго кнігі, артыкулы, прамовы, даклады, — і адразу, без асобай цяжкасці, кожны заўважыць, што яны выходзяць з прынцыпаў марксізма-ленінізма, з указанняў партыі. А гэта якраз і з'яўляецца каштоўнейшай уласцівасцю совецкага дзяржаўнага дзеяча. Без такой уласцівасці не можа быць правільнага напрамку ў штодзённай рабоце. Яна-ж мае на ўвазе і вялікае майстэрства ў ажыццяўленні правільнага напрамку.

Быць верным байцом партыі — вялікая справа. Нездарма ў самыя вастрэйшыя моманты, перажываемыя нашай краінай, наглядаецца вялікі прыплыў у партыю лепшых людзей. Нездарма перад бітвай ці перад выкананнем якога-небудзь небяспечнага задання на фронце беспартыйныя людзі просяць прыняць іх у партыю. Гэта мае глыбокі сэнс.

Таварыш Молатаў з'яўляецца ўзорам вернасці партыі, вернасці марксізму-ленінізму. Яго падыход да вырашэння вялікіх і малых пытанняў заўсёды абумоўлен глыбокай партыйнасцю. Ад пачатку сваёй рэволюцыйнай дзейнасці да нашых дзён стаіць ён у першых радах у барацьбе за партыю. Усё гэта лепш за ўсё паказвае глыбокае разуменне ім марксізма-ленінізма, уменне прымяняць яго ў практычным жыцці і ў сваёй дзяржаўнай дзейнасці.

Сёння партыя, совецкі народ з пачуццём велізарнага задавальнення і з гордасцю вымаўляюць слаўнае імя таварыша Молатава, як сімвал большэвіцкай партыйнасці, як залог вернасці совецкага ўрада народным інтарэсам і непераможнаму сцягу Леніна—Сталіна. Яны шлюць яму гарачае прывітанне і свае віншаванні. Яны жадаюць яму ад усёй душы яшчэ многа, многа год працаваць на карысць працоўных, у імя росквіту нашай радзімы, для заваявання комунізма.



В. М. Молатаў на крэйсеры «Красный Кавказ». З карціны маст. Авдуратава.

50-годдзе з дня нараджэння В. М. Молатава

ДАРАГІ ТАВАРЫШ МОЛАТАЎ!

У дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя Прэзідыум Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік горача вітае Вас — вернага сына комуністычнай партыі, слаўнага кіраўніка Ўрада соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян, нястомнага барацьбіта за справу Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

Слаўны шлях за дня свайго пяцідзесяцігоддзя пройдзен Вамі — выхаванцам вялікай партыі Леніна—Сталіна. Працуючы ў радах большэвіцкай арганізацыі пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна, Вы заўсёды выступалі як рашучы барацьбіт за паслядоўна рэволюцыйную ленінскую лінію. Зрочныя годы сталыпінскай рэакцыі, арышты і ссылкі не пахіснулі Вашу стойкасць, мужнасць і рэволюцыйную самаадданасць у барацьбе з царызмам і буржуазіяй.

У кастрычніцкія дні 1917 года Вы, як бліжэйшы саратнік Леніна і Сталіна, знаходзіліся ў штабе, які кіраваў штурмам капіталістычнага ладу, і з'яўляліся адным з арганізатараў пабеданоснага ўзброенага паўстання рабочых і сялян.

Пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі Вы працавалі на адказных участках дзяржаўнага і партыйнага будаўніцтва, арганізуючы працоўных на барацьбу за перамогу совецкай рэспублікі.

У наступныя годы жорсткай барацьбы супроць агентуры капіталістычнага акружэння — пролетарыі, працоўныя ведаюць Вас як бліжэйшага саратніка вялікага Сталіна, як непахіснага кіраўніка ў барацьбе за соцыялізм.

Ваша непрымірымасць да ўсякіх скажэнняў марксізма-ленінізма, няўхільная паслядоўнасць у правядзенні генеральнай лініі партыі, бязлітаснасць у барацьбе з ворагамі партыі і народа заўсёды будуць служыць прыкладам ленінска-сталінскай партыйнасці.

У сваёй дзяржаўнай рабоце на пасту Старшыні Совета Народных Камісараў СССР Вы з'яўляецеся ўзорам бліскучага спалучэння партыйнага і дзяржаўнага дзеяча ленінска-сталінскай эпохі.

Пад Вашым практычным кіраўніцтвам ажыццяўляліся сталінскія пяцігодкі, разгортвалася грандыёзная работа па ўмацаванню эканамічнай і абароннай магутнасці Совецкай дзяржавы.

Ва ўмовах выключных ускладненняў у міжнародных адносінах, разгарнуўшайся другой імперыялістычнай вайны, на Вас ускладзена непасрэднае кіраўніцтва знешняй палітыкай Совецкай дзяржавы. Гэтыя задачы Вы паспяхова вырашаеце ў інтарэсах бяспаснасці СССР і забеспячэння мірнай працы народаў Совецкага Саюза.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, адзначаючы Вашы велізарныя заслугі перад соцыялістычнай радзімай, шле Вам свае гарачыя пажаданні яшчэ доўгія і доўгія годы жыць і працаваць на карысць і шчасце народаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік



В. М. Молатаў і І. В. Сталін на трыбуне маўзалея. Малюнак маст. В. Сварога.

УКАЗ
Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
Аб узнагароджанні Старшыні Совета Народных Камісараў СССР тав. Вячэслава Міхайлавіча Молатава ордэнам Леніна

За выдатныя заслугі ў справе арганізацыі большэвіцкай партыі, стварэння і ўмацавання совецкай дзяржавы ўзнагародзіць Старшыню Совета Народных Камісараў СССР таварыша **Вячэслава Міхайлавіча Молатава,** у дзень яго пяцідзесяцігоддзя, — **ордэнам Леніна.**

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Вернаму саратніку Леніна і Сталіна, главе совецкага ўрада— Вячэславу Міхайлавічу Молатаву

У дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя Совет Народных Камісараў Саюза ССР шле Вам большэвіцкае прывітанне і гарачыя пажаданні добрага здароўя і сіл на многія і многія годы.

У Вашай асобе Совет Народных Камісараў Саюза ССР вітае вернага саратніка Леніна і Сталіна, дзеяча ленінска-сталінскага тыпу, спалучаючага ў сабе большэвіцкую непрымірымасць да ворагаў з глыбокай адданасцю справе свайго народа, сваёй партыі.

Усё сваё свядомае жыццё, з маладых год, прысвяцілі Вы справе вызвалення рабочага класа і трыумфу соцыялізма. Яшчэ пры царызме, высока трымаючы сцяг Ленінскай партыі, Вы нястомна змагаліся за нізвяржэнне царызма, за перамогу рэволюцыі. Вы правялі выдатную работу па будаўніцтву нашай партыі, як да рэволюцыі, так і пасля перамогі дыктатуры пролетарыята. Вы ў якасці члена Петраградскага ваенна-рэволюцыйнага камітэта ў дні Кастрычніцкай рэволюцыі змагаліся за ўрачыстасць совецкай улады. Усе годы соцыялістычнай рэволюцыі ў якасці партыйнага і совецкага кіраўніка, на ўсіх этапах барацьбы за перамогу ленінізма, за знішчэнне ворагаў комунізма з усёй прынцыповай паслядоўнасцю неслі Вы баявы сцяг партыі Леніна—Сталіна.

Ваша пяцідзесяцігоддзе супадае з дзесяцігоддзем Вашага прабывання на пасту старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР, дзесяцігоддзем, насычаным выдатнымі падзеямі як ва ўнутраным жыцці нашай вялікай радзімы, так і ў міжнародных адносінах.

За гэтыя дзесяць год совецкая краіна пад кіраўніцтвам нашага вялікага Сталіна атрымала бліскучыя перамогі па ўсіх участках барацьбы за соцыялізм. За гэтыя годы ў СССР атрымалі перамогу і ўвасобіліся ў жыццё вялікія прынцыпы соцыялізма. На працягу ўсіх гэтых год Вы былі і застаецеся бліжэйшым памочнікам таварыша **Сталіна** ў справе пабудовы ў СССР соцыялізма, у справе арганізацыі совецкай соцыялістычнай гаспадаркі, новага соцыялістычнага грамадства, новай соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

У сваёй паўсядзённай дзяржаўнай рабоце на пасту главы Совецкага Ўрада Вы паказваеце ўзор ажыццяўлення ўказанняў і дырэктыў Партыі, выхоўваючы ў кіраўніках і ўсіх работніках дзяржаўнага апарата глыбокую адданасць справе Леніна—Сталіна, пачуццё адказнасці і ўсведамленне свайго партыйнага і дзяржаўнага абавязка ў рабоце.

У сваёй рабоце па арганізацыі народнай гаспадаркі, па распрацоўцы і ажыццяўленню пяцігадовых планаў, па пад'ёму соцыялістычнай культуры Вы заўсёды і нязменна паказваеце і вучыце, як трэба па-большэвіцку, па-сталінску вырашаць гэтыя пытанні.

Як выдатны партыйны і дзяржаўны дзеяч, Вы нястомна працуеце над умацаваннем совецкай дзяржавы, няўхільна выкрываючы спробы ворагаў народа развініць і падарваць моц совецкага дзяржаўнага апарата.

Як выдатнейшы арганізатар совецкай эканомікі і культуры, Вы аддаеце ўсе свае сілы на ўмацаванне гаспадарчай магутнасці Совецкага Саюза, на справу ўздыму культурнага і матэрыяльнага дабрабыту працоўных нашай радзімы, на згуртаванне ўсіх народаў нашай радзімы вакол совецкай улады і партыі Леніна—Сталіна.

У якасці главы Совецкага Ўрада і Народнага камісара замежных спраў Вы з'яўляецеся верным і паслядоўным праваднікам ленінска-сталінскай знешняй палітыкі совецкай дзяржавы, змагаючыся за ўрачыстасць справы міру ў міжнародных адносінах і няўхільна ажыццяўляючы клопаты аб умацаванні абараназдольнасці нашай дзяржавы, магутнасці і славы нашай непераможнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

У Вашай асобе мы вітаем главу Совецкага ўрада, друга і памочніка нашага вялікага настаўніка і правадыра таварыша **Сталіна.**

Няхай жыве вялікая партыя **Леніна—Сталіна!**

Няхай жыве правадыр соцыялістычнай дзяржавы—вялікі **Сталін!**

Няхай жыве глава Совецкага Ўрада Вячаслаў Міхайлавіч **Молатаў!**

Совет Народных Камісараў Саюза ССР

МАСКВА, КРЭМЛЬ. Таварышу МОЛАТАВУ

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч!

Ваенны Совет Беларускай Асобай Ваеннай Акругі ад імені ўсіх байцоў, камандзіраў, камісараў і палітработнікаў у дзень Вашага слаўнага 50-годдзя шле Вам — вернаму спадвіжніку вялікага Сталіна—гарачае чырвонаармейскае прывітанне і віншаванні.

З Вашым іменем, Вячэслаў Міхайлавіч, неразрыўна звязаны сусветна-гістарычныя перамогі соцыялізма ў нашай краіне, велізарная работа па падняццю ваеннай і марской магутнасці Совецкага Саюза, поспехі мірнай палітыкі СССР.

Байцы, камандзіры, камісары і палітработнікі штодзенна адчуваюць Вашы нястомныя клопаты аб Чырвонай Арміі. Ваша імя натхняе іх на барацьбу за новыя поспехі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы, на выдатныя подвігі ў баях з ворагамі радзімы.

Ніколі не забудуць воіны Беларускай Асобай Ваеннай Акругі Вашай гістарычнай прамовы, сказанай 17 верасня 1939 года. З найвялікшым пачуццём гордасці за нашу радзіму, вялікага Сталіна, часці БАВА ў кароткі тэрмін змялі і знішчылі ворага, вырвалі з лапцугоў рабства працоўных Заходняй Беларусі.

Ад усёй душы жадаем Вам жыць доўгія, доўгія годы і працаваць на славу нашай цудоўнай радзімы, на славу комунізма, на карысць працоўных усяго свету.

Ваенны совет БАВА:
М. КАВАЛЕЎ,
П. СМАКАЧОЎ,
К. ГУСЕЎ,
П. ПАНАМАРЭНКА.

МАСКВА, КРЭМЛЬ, Таварышу Молатаву

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч!

Пісьменнікі Совецкай Беларусі шлюць Вам, вернаму вучню вялікага Леніна, другу і саратніку правадыра народаў таварыша Сталіна, Вам, главе ўрада вялікага Совецкага Саюза, свае гарачае прывітанне і гарачыя віншаванні ў дзень Вашага юбілея — 50-годдзя з дня нараджэння.

Нястомны змагар за шчасце народа, непахісны сын большэвіцкай партыі, кіраўнік урада магутнай краіны Советаў і знешняй палітыкі соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян,—Вы яўляеце сабою класічны вобраз дзеяча ленінска-сталінскага тыпу.

Невымерна вялікія Вашы, Вячэслаў Міхайлавіч, заслугі ў справе соцыялістычнай перабудовы нашай краіны, пабеданоснага будаўніцтва комунізма, у справе ўмацавання магутнасці нашай краіны.

Далучэнне беларускага і ўкраінскага народаў да адзінай сям'і пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, братняя дапамога фінляндскаму народу, забеспячэнне бяспаснасці горада Леніна і недатыкальнасці граніц СССР — гэта найвялікшыя перамогі сталінскай палітыкі міру, якая праводзіцца совецкім урадам, главой якога з'яўляецеся Вы.

Ваш слаўны жыццёвы шлях, Ваша дзейнасць большэвіка — арганізатара мас, буйнейшага тэарэтыка марксізма-ленінізма, мудрага дзяржаўнага дзеяча—служаць для нас, совецкіх літаратараў, узорам натхнёнага служэння народу.

Жадаем Вам, Вячэслаў Міхайлавіч, многіх і многіх год жыцця на карысць вялікага совецкага народа, на карысць нашай радзімы, на карысць комунізма.

Праўленне і партарганізацыя Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ МУЗЫЧНАГА МАСТАЦТВА

Дзякуючы няспынным клопатам партыі і ўрада музычнае мастацтва Совецкай Беларусі дасягнула выдатных поспехаў. За апошні час беларускімі совецкімі кампазітарамі створаны чатыры оперы, балет, рад сімфанічных, камерных, харавых твораў, шмат масавых песень. Значна ўзнялася якасць твораў, што сведчыць аб росце майстэрства кампазітараў. Многія творы беларускіх кампазітараў выконваюцца на канцэртных пляцоўках Масквы, Ленінграда, Кіева, Харкава, Одэсы, Тбілісі і іншых буйнейшых гарадоў Совецкага Саюза.

Значна ўзрасла і выканаўчая культура. Кадры нашых выканаўцаў выраслі і якасна і колькасна, папоўніўшыся маладымі спецыялістамі і майстрамі з братніх рэспублік.

Велізарнае значэнне ў развіцці музычнага мастацтва БССР адыграе падрыхтоўка да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, да якой з радасцю, з хваляваннем і творчым уздымам рыхтуюцца ўсе работнікі мастацтваў нашай рэспублікі.

Стварыліся ўсе прадпасылкі для таго, каб сур'ёзна паставіць пытанні, звязаныя з далейшым ростам музычнага мастацтва, намеціць яго перспектывы і шляхі, па якіх яно павінна ісці ў 1940 годзе. Той факт, што найбольш паказальнай аказалася работа нашых кампазітараў у галіне стварэння нацыянальнай беларускай оперы і балета, якія заклалі аснову рэпертуару нашага Опернага тэатра, ставіць перад намі пытанне аб падагульненні гэтай работы, аб уважлівым разборы яе і вырашэнні тых задач, якія стаяць перад беларускім оперным мастацтвам. Устае неабходнасць арганізацыі шырокай нарады па выніках і далейшых задачах опернай творчасці.

Поспехі ў стварэнні нацыянальных опер і балетаў накіравалі ўвагу нашых лепшых аўтараў іменна па гэтай лініі. Гэта, вядома, правільна, але ў той-жа час даная акалічнасць адцягнула ўвагу кампазітараў ад належнага развіцця іншых жанраў музычнага мастацтва і асабліва ад найвышэйшай яго формы — сімфанічнай музыкі. У 1939 годзе кампазітары стварылі надзвычай мала работ у гэтай галіне. Трэба прыняць пад увагу і тую акалічнасць, што папярэднія годы былі ў асноўным перыядам асваення сімфанізма, перыядам вучобы, накаплення ведаў і тэхнікі. Таму зусім зразумела, што развіццё беларускай сімфанічнай музыкі з'яўляецца зараз адной з першачарговых задач.

Намечанае Ўпраўленнем па справах мастацтваў правядзенне творчай канферэнцыі па гэтаму пытанню з удзелам буйных сімфаністаў СССР безумоўна павінна даць вялікія рэзультаты.

Не меншай важнасці пытанні стаяць і ў галіне стварэння камернага рэпертуару, розных сольных і ансамблевых інструментальных і вакальных твораў, а таксама ў справе стварэння совецкага беларускага рамanса і масавай песні.

Удалы вопыт сумеснай работы А. Русака і І. Любана, поспех іх песні «Бывайце здаровы» павінен з'явіцца прыкладам для нашых пісьменнікаў і кампазітараў.

Сур'ёзнай увагі патрабуе і справа стварэння эстраднага рэпертуару, насычэння яго баявым, злабадзённым палітычным фельетонам, сатырай, добрай народнай песняй, совецкім лірычным рамансам і г. д. Гэтай важнай справай ніхто з нашых творчых работнікаў дагэтуль не займаўся і Ўпраўленне па справах мастацтваў у 1940 годзе павінна забяспечыць належнае ўзбагачэнне рэпертуару эстрады.

Пытанні творчасці і выканаўчай практыкі цесна звязаны з распрацоўкай навуковых і тэарэтычных даных у галіне гісторыі беларускай музыкі, беларускага музычнага фальклору. Гэта важнейшая работа павінна быць планавай і сістэматычнай. Ажыццяўленнем яе павінна ў першую чаргу займацца гісторыка-тэарэтычная кафедра Кансерваторыі БССР, дзе для гэтага ёсць патрэбныя кадры работнікаў.

Камерныя канцэрты і камерныя выступленні, як найбольш высокія формы выканаўчай практыкі, у нас дагэтуль не карыстаюцца належнай увагай.

Для эстрады карэнным пытаннем, патрабуючым свайго вырашэння ў 1940 годзе, з'яўляецца пытанне вырошчвання беларускіх кадраў самых разнастайных жанраў. У гэтай галіне мы павінны арыентыравацца не толькі на прафесіяналаў-актораў, але і на самадзейнасць, дзе ў сучасны момант можна знайсці не мала цікавых эстрадных выканаўцаў.

У справе ўмацавання і падрыхтоўкі як творчых, так і выканаўчых кадраў неабходна палепшыць работу па выхаванню моладзі.

Адказныя задачы ўстаюць перад намі па аб'яднанню кампазітарскіх і выканаўчых кадраў у заходніх абласцях БССР. Арганізацыя лекцый, курсаў і канферэнцый па перападрыхтоўцы кадраў, умацаванне сеткі музычных арганізацый, правядзенне дэкады совецкай музыкі і, нарэшце, збіранне, вывучэнне і апрацоўка народнай музычнай творчасці ў заходніх абласцях, —усё гэта патрабуе і ад кіраўніцтва, і ад работнікаў музычнага фронта вялікай і сур'ёзнай увагі.

У сучасны момант для ўсяго фронта мастацтваў галоўнейшай задачай з'яўляецца стварэнне твораў совецкай класікі.

Гэтай задачы павінна быць падпарадкавана ўся наша практыка. Стварыць высокаідэйны твор, глыбокі па мыслі, майстэрскі і ў той-жа час даступны, — вось агульная мэтавая ўстаноўка і кампазітара і выканаўца.

Опера, сімфонія, папулярны сімфанічны твор, лірычны раманс, масавая песня — усё важна і аднолькава патрэбна нашаму народу. Важна тое, каб у любым з гэтых жанраў ісці па шляху стварэння совецкага класічнага твора.

Мастацтва Совецкай Беларусі падрыхтавана для таго, каб паспяхова вырашыць гэту пачэсную задачу.

Н. ШЧЭГЛОЎ.

ПЕРАСОВАЧНАЯ ГОРКАЎСКАЯ ВЫСТАЎКА

Інстытут сусветнай літаратуры ім. Горкага накіраваў у Мінскі Дом Чырвонай Арміі вялікую перасовачную выстаўку, прысвечаную жыццю і творчасці Аляксея Максімавіча Горкага. Размешчаная ў велізарным фае ДЧА, гэта выстаўка на працягу 20 дзён прыцягвала ўвагу байцоў і камандзіраў.

Лекцыі на тэмы: «Наш Горкі», «Горкі і сучасная літаратура», «Горкі і Чырвоная Армія» чыталі навуковыя работнікі інстытута т. т. Левін і Матвейчук.

Ёсць пісьмо Горкага да чырвонаармейскіх пісьменнікаў БАВА. У гэтым пісьме вялікі пісьменнік ставіў перад абароннымі пісьменнікамі рад сур'ёзных творчых задач. Знаходжанне горкаўскай выстаўкі ў Мінску было выкарыстана для таго, каб праверыць выкананне горкаўскіх указанняў. А зроблена не мала. Аб гэтым сведчаць вялікія літаратурныя вечары чырвонаармейскай творчасці.

Б. Макарцаў, лётчык, член саюза пісьменнікаў, напісаў новую п'есу аб распадзе Польшчы. Работнік штаба БАВА тав. Аляксееў закончыў раман, першы буйны, заслугоўваючы ўвагі, твор. Чырвонаармеец Белянічаў—удзельнік вызваленчага паходу ў Заходнюю Беларусь—стварыў цыкл апавяданняў аб перажытым, бачаным, прачутым.

Творчы актыў чырвонаармейскіх пісьменнікаў значна ўзбагаціўся новымі імёнамі.

Каля тыдня горкаўская выстаўка прабыла ў чырвонаармейскім клубе Н-скай часці і зараз накіравана ў гор. Брэст. На чарзе—наведанне Беластока і іншых буйнейшых гарадоў заходніх абласцей.

На прыкладу Мінска, гарнізоннае аб'еднанне пісьменнікаў створана пры Доме Чырвонай Арміі ў Беластоку.

Любоў да Горкага, вернасць яго літаратурным заветам узбагачае літаратурную вучобу байцоў Беларускай асобай ваеннай акругі.

Е. С.

Г. БЯРОЗКІН

АБ ВЕРШАХ

Мы вельмі засумавалі па добрых вершах. Часам здавалася, што п'еса, опернае лібрэта канчаткова адаб'юць ахвоту ў нашых паэтаў займацца вершамі. І адзінай уцехай для нас з'яўлялася ўсведамленне таго, што ў развіцці любой літаратуры непазбежна бываюць такія перыяды, калі верш адыходзіць на задні план, саступаючы месца іншым літаратурным жанрам. Тым больш у нашай літаратуры такое змяшчэнне жанраў было зусім заканамернай станоўчай з'явай. Яно падрыхтавала новы ўздым паэзіі, аб якім зараз можна гаварыць як аб рэальным, адбыўшымся факце.

Справа ў тым, што паэзія апошніх год не магла нас поўнасцю задаволіць.

Паэты пісалі на вельмі важныя і адказныя тэмы, знаходзілі вельмі насычаныя ў сэнсавых адносінах словы, мяркуючы, што ляжачая ў аснове верша рытмічная, вобразная і ўласна-паэтычная сістэма з'яўляецца рэччу другараднай, малаістотнай. З раззбройваючай наіўнасцю сфармуліраван гэты погляд на вершы ў адным выпадкова трапіўшым нам пісьме літаратурнага кансультанта да пачынаючага паэта. «Сутнасць верша,—піша гэты «кансультант» па паэзіі,— заключаецца перш за ўсё ў яго змесце, потым у падачы гэтага зместу пры дапамозе мастацкіх вобразаў, а форма—гэта ўжо як сродак для палягчэння чытання і запамінання вершаў...»

Нам шкада маладых. Атрымліваючы зусім бессэнсоўныя настаўленні аб змесце і форме, выхоўваючыся на самых наіўных уяўленнях аб паэтычнай форме, як аб вонкавым, «абслугоўваючым» элеменце верша, нашы маладыя паэты спешна рэалізуюць гэту «навуку» у адпаведны вершавы матэрыял.

Але не толькі маладыя. Нават паасобныя добрыя нашы паэты часта сваёй уласнай практыкай паглыбляюць супярэчнасці паміж семантычнымі і ўласна-паэтычнымі момантамі верша. Вазьміце, к прыкладу П. Глебку. Стыль многіх вершаў П. Глебкі — гэта стыль слова, стыль рытарычнай фразы, якая існуе сама па сабе, па-за якойсьці цэласнай паэтычнай сістэмай. Такому ўражанню ад вершаў Глебкі не ў малой ступені спрыяе і тое, што ў іх, за рэдкім выключэннем, адсутнічае дэталь, блізкі абыдзённы прадмет, рэч з усімі яе трыма рэальнымі вымярэннямі,— г. зн. адсутнічае сама магчымасць канкрэтызіраваць велізарнасць маштабаў праз «зрымое» параўнанне, вобраз, дэталь. Гэта і ёсць адна з прычын стварыўшагася разрыву паміж сэнсам верша і яго канкрэтна-пачуццёвай прыродай.

Дзе-ж выйсце? Выйсце ў пераключэнні на новы матэрыял, у аднаўленні парушанага адзінства, хоць-бы і ў рамках новага жанру. Для Глебкі гэтым новым жанрам з'явілася трагедыя ў вершах.

Хочацца думаць што Глебка зрабіў «экскурс» у гэту недаследаваную галіну па камандыроўцы «ад паэзіі», што напісаўшы добрую вершаваную п'есу, паэт, узбагачаны новым вопытам і новымі магчымасцямі, створыць сапраўдныя вершы, якія будуць вершамі не па вонкавых абрысах, а па сутнасці.

Прыклад П. Броўкі ўмацоўвае ў нас гэту веру. У творчасці П. Броўкі апошніх год таксама намячаўся пэўны адыход ад патрабаванняў верша ў бок агульна-апісальных меркаванняў.

Не ставячы сабе мэтай аналізаваць паэму «Кацярына» (гэта тэма спецыяльнага артыкула) укажам толькі на тыя яе асаблівасці, якія раскрываюцца ў сувязі з цікавячай нас праблемай. Чаму верш? —вось пытанне, якое ўзнікае пры чытанні «Кацярыны». Якія дадатковыя задачы (апрача тых агульна-ідэйных і мастацкіх задач, якія немінуча ўзнікаюць у рабоце над любой рэччу) вырашыў паэт, працуючы над паэмай, над вершаваным жанрам? Такія-ж задачы бясспрэчна былі. Калі Пушкін працаваў над «Онегіным», ён пісаў Вяземскаму: «Я нинер пішу не раман, а раман у вершах —д'явальская розніца...» Пушкін поўнасцю ўсведамляў спецыфічнасць работы над раманам у вершах у адрозненне ад «проста рамана». У «Кацярыне» гэта розніца не адчуваецца. Верш даведзен да ўзроўню абслугоўваючага элемента. Ён толькі ўючная жывёла, якая пераносіць тэму з месца на месца, з году ў год, са становішча ў становішча.

Пасля «Кацярыны» Броўка працаваў у тэатры, пісаў опернае лібрэта. Зараз ён надрукаваў новы цыкл вершаў, які дазваляе гаварыць аб значным творчым росце паэта.

Вершы сведчаць аб тым, што Броўка ўступіў у паласу сваёй творчай спеласці. Ужо не як вонкавая адзнака апісання і не як рытарычны жэст існуе новы верш Пятруся Броўкі. У новым вершы Броўкі ёсць праўда пераходаў ад лозунга да лірычнага шопату, ад апісання да пафасу. Паэту няма патрэбы рабіць асобныя намаганні для таго, каб дацягнуцца да палітычна-грамадзянскай тэмы — гэта тэма ў яго ў крыві.

Ітак, вершы надрукаваны. Што далей? Ці намячаюць гэтыя новыя вершы Броўкі шляхі да яго далейшага паэтычнага развіцця? Над гэтым пытаннем нам хацелася-б падумаць разам з паэтам. Па характару свайго дараванн, «па складу сваёй душы, па самай радковай сутнасці» Броўка — паэт-прамоўца, паэт строга вызначанай інтанацыйнай устаноўкі. І таму нам здаецца, што далейшае развіццё паэзіі Броўкі павінна ісці іменна па лініі арганічнага свайго ўдасканалення, як паэзіі аратарскай, інтанацыйнай. Тым больш, што час зараз суровы, ваенны, над светам ходзяць кавалеічныя хмары. — і суровае, насычанае глыбокім пачуццём, аратарскае слова паэта іменна зараз мае велізарнае значэнне. Няхай надрукаваныя вершы Броўкі паслужаць для яго адпраўным пунктам да пошукаў такой-жа натуральнасці і праўды, але толькі ў іншым плане інтанацыйнага верша.

Значнай падзеяй нашай паэзіі з'яўляюцца новыя вершы А. Куляшова «Юнацкі свет». Прынцыповае значэнне гэтых вершаў, калі разглядаць іх з пункту гледжання намечаных намі агульных заканамернасцей паэтычнай работы, заключаецца ў іх глыбока-паэтычным змесце. Наіўнае ўяўленне аб паэзіі абессэнсоўвае вершаваную рэч, расцэньвае не толькі як непазбежнае адступленне ад «нармальных» правілаў мовы. Спытайцеся ў нашага «кансультанта па паэзіі», як ён уяўляе сабе работу над вершам, і ён вам адкажа прыкладна так: паэт бярэ пэўную мысль, якую ён хоча выразіць, і фаршыруе яе ў які-небудзь паэтычны размер, і ад узаемадзеяння гэтых двух момантаў ствараецца паэзія...

Вершы А. Куляшова абвяргаюць гэта ўяўленне, яны па-свойму сцвярджаюць паэзію, як арганічны від мышлення, як адзіны рытміка-семантычны комплекс. Гэтыя вершы не могуць быць пераказаны прозай, ад такога пераказу яны страцяць добрую палову свайго зместу. Куляшоў мысліць цэласнымі паэтычнымі замысламі і амаль ніколі не карыстаецца трафарэтам. Возьмем верш «Шаршні». У ім тэма далёкіх дзіцячых успамінаў, якія па-новаму ўспрымаюцца паэтам з пункту гледжання яго спелага вопыту, нечакана нараджае ўскладнены, але надзвычай дакладны вобраз. Сум паэта, адчуўшага горыч першага адхіленага кахання, раптам становіцца пчалой, гулучым шэршнем — далёкім выхадцам з першых сустрэч, з першых, дзіцячых гульняў, з першых успамінаў. Так, паэт еднае мноства разнастайных асацыяцый не з мэтай «выдумаць» «экстравагантны» вобраз, а цалкам апраўдваючы іх інтэнсіўнасцю перажывання, ажыўляючы іх напружаннем мыслі. Пры гэтым Куляшоў умее захаваць рэалістычную дакладнасць апісання, абаянне і яснасць упершыню бачанага.

Міма школы меленькая рэчка
Без мяне адна плыве ў цішы.

Незвычайная празрыстасць гэтых радкоў адхіляе ўсякую магчымасць «пераўвялічана»-трагедыйнага гучання тэмы. Каханне, аб якім гаворыць Куляшоў, празрыстае і яснае, як гэтыя радкі. Яно не засланяе жыццё, а, наадварот, прымушае больш цвяроза, больш прыстальна ўглядацца ў навакольнае. Лёгкі сум не здымае агульнага жыццесцвярджальнага пачуцця, а толькі робіць яго больш важкім і пераканаўчым. Далёкія дзіцячыя ўспаміны зліваюцца ў адно з новым імкненнем у будучае, —і ўсё гэта стварыла добры і ў высокай ступені паэтычны цыкл вершаў.

Папрок, які мы можам зрабіць Куляшову, у большай меры адносіцца і да іншых паэтаў, якія працуюць над стварэннем новай лірыкі.

У іх вершах аб дружбе, аб каханні, аб прыродзе мала неспакою, а больш уціхамірваючых забрадушных пачуццяў. Баявы, актыўны тэмперамент нашага сучасніка павінен у аднолькавай меры адчувацца ў палітычных вершах і ў вершах, якія напісаны на традыцыйна-лірычныя тэмы.

Ці-ж не таму так цёпла былі сустрэты франтавыя вершы М. Калачынскага, што яны нясуць у сабе адчуванне трывогі, жывы вопыт гераізма? Неймаверна вырастае павага да вершаў, калі яны напісаны ля вогнішча, у самай сапраўднай абстаноўцы бою.

М. Калачынскі доўгі час займаўся тым, што паўтараў вонкавыя сродкі паэзіі, зацверджаныя і агульнадаступныя тэхнічныя прыёмы верша, — зараз ён прышоў да сапраўднай творчасці. У яго новых вершах аб Фінляндыі няма гучных батальных спэн, замест іх ёсць разумная і ўдумлівая сканцэнтрыраванасць на асэнсаванні сапраўдных мэт нашай вызваленчай вайны. Таму такія добрыя вершы аб смалакуру, аб рыбаку, якія — вернуцца, якія прыдуць у свае разбураныя хаты.

Нашым паэтам-лірыкам пагражае небяспека ўпасці ў новы штамп гэтакага ўціхаміранага, бестурботнага пейзажа. Гэту небяспеку трэба папярэдзіць, бо тое, што з'яўляецца толькі небяспекай для Броўкі, для Куляшова, становіцца паўным «курсам» для многіх маладых вершатворцаў. Услед за вершамі Броўкі аб прыродзе, услед за «Воблакам» Куляшова, за «Надсочкай» Панчанкі пайшоў цэлы паток вершаў пачынаючых паэтаў, у якіх зусім страчана пачуццё сучаснасці. Дажджы, птушкі, бярозкі — і больш нічога. Вы чаго гэта, таварышы, чырыкаеце?

Нам трэба любіць паэзію ўжо толькі за тое, што яна ствараецца на фронце, у вельмі цяжкіх умовах, якія не выклікаюць «лірычнай» дабрадушнасці. Прайшоўшы казематы турмы, шыбеніцы, паэзія прыходзіць да нас, як вестка блізасці і спагады, як вялікі сардэчны прыяцель.

Зараз ужо нельга гаварыць аб росце нашай паэзіі без таго, каб не спыніцца на творчасці Танка. Ён прынёс нашай паэзіі незвычайную навізну і сілу вялікага паэтычнага тэмпераменту. Вершы Танка, насычаныя пафасам, сарказмам, перажытым болем, нясуць у сабе велізарны зарад ваяўнічай чалавечнасці, якая адстойвае свае правы ў атмасферы маны, гвалту, гнёту. Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што іменна паэзія, іменна верш з'яўляўся дзейсным сродкам рэволюцыйнага гуманізма, іменна ў вершы знайшлі сваё выражэнне лепшыя імкненні народа. У выдатным вершы Ф. Пестрака «Паэзія» з вялікай сілай перададзен матыў гранічнай змешанасці вершаў з навакольнай, вельмі нярадаснай жыццёвай абстаноўкай.

Ты просішся ў дзверы маёй беднай хаты
Восеннюю ветранай, цёмнаю ноччу...—

гаворыць Пестрак, звяртаючыся да паэзіі. Яму ўторыць малады паэт Таўлай у сваіх лукішскіх вершах:

Цілую вершам краты.

Стыхія лірычнага ўладарна ўварвалася ў нашу паэзію. Перад тварам вершаў, якія ваявалі з непавісным панствам і гадамі пакутвалі ў турмах, павысім нашы патрабаванні к паэтам, канчаткова адкінем тых, хто бачыць у паэзіі безмэтавую бразгалку, якая асалоджвае пяшчотны слых. Паставім у парадку нашага працоўнага дня важнейшае пытанне аб паэзіі.

ВАЛЕНЦІН ТАЎЛАЙ

ПЕСНЯ ПРА СУХАРА

(УРЫВАК З ПАЭМЫ)

1.

Хто вам сказаў, што спяваць
    толькі можна
Пра чорнавочку, як гляне зарою?
Я сягоння
    спяваю ўстрывожана
Песню
    пра сухара-героя.
Жыць сухар не дае мне гэты,
Вывернуў сэрца на завіруху...
Доля такая — заўсёды ў паэта...
Хочаце слухаць?
    — Слухаем!

2

Рос адзінокі па ніве сухар...
Пьфу!.. Не сухар — колас...
Ростам быў ён такі, як блыха
На валасінцы кволай.

Беглі калоссе збіраць на хлеб
Дзеці мужыцкай голі:
Тое калоссе не выгрыз серп,
Асірацішы поле.

Вось і папаўся колас наш
Торбе ў вутро дзіцячай,
А будзе голі з бядой вайна —
І колас нешта значыць.

Бо і чаму-ж то сорам было-б
Па сірату схіліцца:
Бацькаў шнур вузкі і жменя — сноп,
Хлеб іх — зарос мятліцай.

Ой, хлебатворны, святы дзянёк —
Госпейка наш няверны,
Хай багацейшы будзе прыпёк
Бедным дзіцячым зернем.

Горда імчаліся шукачы
Разам са скарбам да хаты.
— Мам, мамачка, хлеб пячы,
Торба сягоння багатая.

Жорны размалі зярнятак мязь,
Маці зрабіла расчыну:
Хлеба такога не есць і князь,
Гэта — пірог па чыну.

І, пахіліўшы бохан на бок,
Бацька ім лусты кроіў.
— Дзеткі, шануйце заўсёды хлябок,
Стойце за чорны — гарою.

І навучыў і скарынку грыз,
Ражучы два акрайцы:
— Гэта мне высушце на сухары,
Толькі-ж згарэць не дайце.

Заўтра, ледзь золак сухотны панік,
Прэцца Паўлюк з-пад гаю.
(Жыць Паўлюку не даюць паны
І па астрогах цягаюць.
А як і выпусцяць —
        хатку яго
Сочаць падкуленым вокам,
Але Паўлюк — пажаданы госць
Для мужыкоў навокал).

Бацька з найбольшым сынком удвох
На загуменных дарожках
Паўла сустрэлі, вядуць на парог,
Павел развязвае ношку.

Быў нейкі іншы бацька ў той міг
І — урачысты на твары.
— Тым, брат, што церпяць за нас,
        вазьмі
Хоць сухароў пару.

3.

— «Ноч,
    ну пальцам у вока торкай:
І месяц прапаў і зоры...» —

Свойскай прышчапнай скорагаворкай
Брату Паўлюк гаворыць —

«Я вярнуся яшчэ сягоння,
Хоць торба гняце не слаба.
Значыць: як ліха крукоў прыгоніць,
Скажы: павалокся к бабе».

Рыпнулі дзверы ледзь чутным зыкам
І ціха пры хаце стала,
Толькі паролем глухім, без'языкім
Ноч Паўлюка прывітала.

І атуліла пяшчотным змрокам
І павяла на ўзмежак,
Не адступаючы ў бок ні кроку
Ад Паўлюковых сцежак.

І не дзівіся, адкуль знаёмасць
З падпольшчыка сцежкай вузкай
Нашай заходніцкай ночкі цёмнай —
Прыгнечанай
    беларускай.

Ладзь, акупанце, новы артыкул
І кайданы-аковы —
Ноч з мужыкамі вядзе без крыку
Комуністычную змову.

Мо' загадаеце даць па карку
І косці патрушчыць ночы? —
Наша чарнявая ноч-бунтарка
Цемрай вам плюне ў вочы.

І не пабачыце простай справы,
Штурмуючай турмаў брамы —
Паўла, што шмытае сцежкай цемравай
З падпольнымі сухарамі.

Сцеляцца вёрсты плаўна і гладка
Палямі-лугамі, борам,
І вырастае на сцежцы хатка,
Пахіленая,
    аж сорам.

Лезе на вочы страха-магерка,
І, мусіць, на сэрцы блага...
Хто-ж цябе, хатка, паіў гарэлкай
Горкай жыццёвай брагай?

Чарпаў ён, мусіць, вялікім кубкам
З гора бяздоннай місы...
Не падавайся-ж мая галубка,
Мацуйся як можаш,
        цніся.

Насцеж разгортвай абнімкі-дзверы,
Змагарскіх сыноў прытуліш —
З сэрцаў сыновых нап'ешся веры,
Пахіленая
        матуля.

І вырастае з трывог і з болю,
Кінутых шчырай жменяй,
Дзень,
    што за чорную брагу-долю
Полымя гневу расцэніць.

Брывёй набракнуць шляхі-разоры,
А бунт — закіпіць радамі,
Каб узняліся хацінкі ўгору
Святліцамі-гарадамі.

За дзень той,
    горда-вялікі,
        шчасны,
За нашых трывог акрасу —
Паўлюк мой любы, ў дарогу час нам:
Ночка не мае часу...

Хай ваяводы дрыжаць і лічаць
Агні, што гараць суздорна.
На акупанта! — бунтам і клічам,
І сухаром чорным!

Вільня—Гродна. Астрогі. 1936—37.



ЛУКІШСКІЯ ВЕРШЫ

Калі натхнення ціхі гром
Трывожыць зноў паэта, —
Не на паперы, не пяром
Пішу я вершы гэта.
Сярод вастрожных крат і пліт
Пагляд на рэчы — іншы:
Папера — той-жа дынаміт,
А пігых — пяро, што піша.
І вытрасаюць кожны дзень
І кішані, і дзіры —
Няма, здаецца, ну, нідзе
Падзецца з беднай лірай.
Вісіць рэгламент як пятля:
І карцар там, і голад...
Спалі маланка вас да тла,
Халодныя намолы!
На вербалозы гэткі страх —
Не нам трасціся нема:
Пішу я ў сэрцы — без пяра —
І вершы і паэмы.
Ты ля дзвярэй, груган, павіс,
Цікавы і — зікраты,
А я, згарнуўшы «рукапіс»,
Цілую вершам краты.
Калі-ж на волю шыбану
З лукішскае каморкі —
Абвесцяць вершы вам вайну
І — шугануць, як зоркі.

Вільня—Лукішкі, 1936.

НЕ ДУРЫ МНЕ, ДЗЯДЗЬКА, ГАЛАВЫ

— Што-ж ты, хлопча, раскідаешся гадамі:
Год—у Гродне, у Вілейцы—год...
Пазнаёміўся з турмой-мадамай,
Зацягнуў цябе дрыгвяны вір балот.
На лукішскія, каменныя палосы
Сееш-сееш маладыя дні—
І ўзрастае боль чорнакалосы,
Горкім жнівам павісае ўніз.
Не такога ты чакаў, брат, ураджаю,
А ў сяўні—паказваецца дно...
— Змоўкні, дзядзька, — ты пярпець
        перашкаджаеш,
Страшна стала—ледзь трасціся пад радно.
Ці-ж табе паноў хлеб-соліць—забароніш?
Не дасі стаяць без шапкі ля варот?
Мне-ж не кракай, дзядзька, як варона,—
Сыру я табе не кіну ў рот.
Дзень і месяц кожны—гэта камень,
А прыглядзься—можа сэрца клок:
Я шпурляю ў панскі твар гадкамі,
Толькі ты не бачыш адналёк.
Засяваеш стогнучую ніву,
І расце там гірсы здрадны пень...
Я-ж пасею сэрца боль маўклівы—
Бунт няхай з яго расце.

Вільня—Лукішкі, 1935.

КОБРЫНШЧЫНА

(Апавяданне ночы летняй)

Кобрынскім паўстанцам
— таварышам па
Лукішках,—на ўспамін.

Ноч была такая летняя ды парная,
Што здалося кожнаму: ну, прышла пара!..
Па сяле затупалі бунтам уладарным,
Выйшлі — на пачатак — праўды парваць.

Ой, паны вяльможныя, ласка ваша колецца:
Не заўважыш — скруціцца гадзінай-пятлёй...
Але сёння наша буйная ваколіца
Шугане ды помстай над зямлёй.

Расступіся, далеч, расступіся, цёмная,
Месяц-дзед з бандурай — за бугром заснуў.
Але нам здавалася, што ў паходным гомане
Бандурыст не хочачы — зачапаў струну.

Сцежкамі-прасёлкамі выйшлі на дарогу.
Глядзь — насустрач гоніцца паліцман адзін:
— Стой, куды паўзеш ты, гадзіна бязногая?
Аддавай ліворвар, з ровара*) зыйдзі!

Прыпыніўся — дзівіцца: што мы за такія —
Не з паклонам нізкім, ды яшчэ крычым...
Як рванем за торбу, як збабоўчым кіем —
Паляцеў панок наш носам у карчы.

А за ім, як гаркне наша стрэльба купная,
Наш абрэз іржавы: ды-мам аб-дало...
Хоць смурод развеяўся—хлопцы носам крупяць:
Першы стрэл—і ў пяты, першы стрэл—не ў лоб.

Шуснуў сіні заяц, шуснуў без аглядкі,
Па дарожцы заячай — толькі трэск ды шум...
— Не журыся, хлопцы, што папалі ў пятку —
Можа мы прастрэлілі панскую душу...

Расступіся, далеч, расступіся, цёмная,
Месяц-дзед з бандурай — за бугром заснуў.
Але нам здавалася, што ў паходным гомане
Бандурыст не хочачы—зачапаў струну.

Грамадой мы рынулі па дварах асадніцкіх,
Што паселі скуламі скрозь ля нашых сёл...
Ну, паны вяльможныя, вам пара скурганіцца —
Стрэльбы здай і ўладу, — мы прышлі па ўсё!

З-пад парын вылазяць, хрысціцца шырока, —
Аддаюць ліворвары, стрэльбы валакуць...
І даходзім так мы — уладарным крокам —
Аж да пана Ксенскага: ён — стшалецкі вудз...**).

Злез пан Ксенскі з ганка на мураўку росную,
Грамадзе схіліўся нізка — аж да ног.
— «Стшэльбу і сабэльку—вэсце, бардзо просэ:
З вамі, таважышэ, сэрцам я даўно.

Чловек естэм просты і з народам—дружны...
Толькі — от нешчэнсце — я касторку піў...
Ад запору, знаеце... Як-бы тут у нужнік...
Я ўцякаць не буду: я-ж зямлю купіў...»

Ой, ты, вою бравы, заняваеш — плаўна,
Так і спадзявайся ад цябе дабра:
Вось прайдзіся лепей — ноч такая слаўная! —
Пагледзі, як будзем пастарунак браць...

А ў паноў таксама тут мабілізацыя,
Націскае з роспачу кожны пан курок
І пытае бога: гіну, пане за цо я? —
Чорт мяне на красы завалок.

Ну, паны вяльможныя, паспрабуйце пораху:
Хлопцы, — наўскрыжа па іх а-гонь!
...Мала мы стралялі—куль не стала скора,
Хоць свярбіць мазольная на паноў далонь.

Ды прыціх і хіліцца — не пытае: за цо? —
Біты нашай куляй белы іх арол:
Ён пад пер'ем вырваным сёння гуз намацае —
Шчыры падарунак паляшуцкіх сёл.

Ну, няхай па сёння і бітва не скончана
І на гнёздах панскіх наш не ўзняўся сцяг —
З храпамі падбітымі выюць сёння гончыя,
Сіцякі залізваюць на сваіх баках.

Ой, ты месяц-месячык—бандурыст старэнькі —
Сеў за гай бярозавы, сеў ды прызаныў,
І здалося хлопцам, што з-за гаю енкнула
Рэха смерці зорнае—трэснутай струны.

Пвеазелі рукі на халодных травах,
Вэзблескам нязбытага ззялі зоры рос...
Узнялі мы вочы: бачым — шлях крывавы
Рассцілаюць золакі па вярхах бяроз.

Эх ты, ночка-зводніца, мы-ж цябе прасілі:
Дню-жняцу суроваму — любка, не міргай.
А цяпер — на ростані залатое сіні
Нас далёкім шумам кліча гай!..

Эх, прыдзі-ж ты, помстухна, хмельнымі пакосамі,
Нашу ночку летнюю, як залог — бяры...
... Толькі-ж сёння, родная, разам з сонца косамі
Пырснуў бунт наш горды па густым бары.

Вільня—Лукішкі, 1935 г.

*) з веласіпеда.
**) правадыр «Стшэльца» («Стралка») — польскай буржуазнай арганізацыі.

Наспеўшае пытанне

★ ★ ★

У ПАРАДКУ АБМЕРКАВАННЯ

★ ★ ★

У № 45 «Звязда» змясціла справаздачную заметку аб выбарчым сходзе партыйнай арганізацыі саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. У гэтай заметцы ёсць такі абзац:

«У спрэчках гаварылі і аб такіх важных пытаннях, як мова і фальклор беларускага народа. Мы лічым няправільным, што асобныя пісьменнікі знаходзяцца яшчэ на павадзу ў старых «мовазнаўцаў», тапчуцца на месцы ў галіне далейшага развіцця і ўзбагачэння беларускай мовы, ачышчэння яе ад усяго напоснага і непатрэбнага. Нам незразумела, напрыклад, чаму такія словы, як «таржаство», «чэсць», упорна ігнарыруюцца органам Саюза совецкіх пісьменнікаў — газетай «Літаратура і мастацтва».

Можна толькі пашкадаваць, што ў такім важным пытанні, як развіццё і ўзбагачэнне беларускай мовы, газета абмежавалася адной агульнай кароткай заўвагай, не выказаўшы канкрэтна і разгорнута свайго пункту гледжання. Нельга-ж, сапраўды, зводзіць усё пытанне да прыкладу з двух выпадкова ўзятых слоў. Пытанні мовы, яе ўдакладнення, развіцця і ўзбагачэння хвалююць не толькі партарганізацыю ССПБ і ўсіх совецкіх пісьменнікаў, — гэта пытанне не ў меншай меры цікавіць шырокія колы совецкай грамадскасці, ў тым ліку і работнікаў друку, якія — таксама, як і пісьменнікі — матэрыялам сваёй работы маюць мову і, апэрыруючы ёю, тым самым уключаны ў працэс фарміравання яе.

Нам здаецца, ужо надышоў час грунтоўна агледзець прароблену на моўным участку работу, прааналізіраваць яе, вызначыць далейшы напрамак. Гэта таму, што мы навочна бачым шмат каштоўнага ў зробленым, але настолькі-ж яўны і відавочны некаторыя памылкі. Час ужо ўзяцца за выпраўленне памылковага, каб спыніць паглыбленне і пашырэнне яго.

Работа па фарміраванню беларускай літаратурнай мовы за апошнія годы ішла па двух напрамках. Першы — ачышчэнне мовы ад усяго непатрэбнага, наноснага, другі — ўзбагачэнне мовы, пашырэнне яе слоўнага багацця, папаўненне тэрміналагічнага слоўніка.

У справе ачышчэння мовы работа грунтавалася на выдаленні непатрэбных і незразумелых шырокім масам народа архаізмаў, правінцыялізмаў і паланізмаў — усяго смецця, жывасілам прыцягнутага ў мову нацдэмамі, якія ставілі сваёй мэтай адрыў беларускага народа ад братняга яму рускага народа. Самае беглае азнаямленне з мовай літаратурных твораў, з мовай газет паказвае, што гэта работа ўжо блізка да свайго завяршэння. Нездарма-ж наўстала і ў друку часткова абмяркоўвалася пытанне аб зменах у правапісе, які ў шмат якіх сваіх раздзелах супярэчыць набытым нормам жывой разгаворнай мовы.

Што да справы далейшага развіцця і ўзбагачэння мовы, дык тут яскрава адно: літаратурная мова арыентыруецца на жывую народную мову, на багаты і шматфарбны фальклор, адкуль чэрпае словы, звароты, пашырае сінанімічнае багацце.

Як для пісьменнікаў, так і для работнікаў друку ясна і бясспрэчна тое палажэнне, што ў выпадках, калі нельга папоўніць слоўніка (у галіне палітычных разуменняў, дакладных навук і т. д.) за кошт наяўных у жывой беларускай мове слоў, — трэба ўзбагачаць беларускую мову пры дапамозе роднаснай і блізкай ёй, багатай і дасканала-развітай рускай мовы. Тут зроблена таксама не мала, але не знойдзены агульныя ўстаноўкі. Бадай, ці не гэта і выклікала заўвагу «Звязды» ў згаданай намі заметцы.

І гэтую заўвагу мы лічым спрэчнай, не абгрунтаванай. Мы сцвярджаем: узбагачэнне літаратурнай мовы грунтуецца ў асноўным на аналізе слоўніка жывой мовы, на разглядзе так званых «слоўных гнёзд», газеты-ж робяць гэта не заўсёды сур'ёзна, прадумана і абгрунтавана. У рабоце газет на ўзбагачэнню мовы ёсць шмат «накладных выдаткаў», якія цягнуць за сабою рад непаразуменняў, разбураюць слоўныя гнёзды, стыкаюць «лоб у лоб» розныя разуменні, пераблытваюць тэрміналогію.

У выніку стварылася такое становішча, якое атрымала пашыраную і слушную назву «чарговых моўных адкрыццяў». Да ліку іх адносяцца такія «шапкі» ў «Чырвонай змене», як: «Будзем працаваць на **блага** народа»; да ліку іх адносяцца артыкулы «Піонера Беларусі» аб дрэнным авалоданні вучнямі беларускай мовай, прычым мова гэтых артыкулаў, як і ўсёй газеты, якраз спрыяе невуцтву; да ліку іх адносяцца радыёперадачы Беларускага радыёкамітэта, пабудаваныя на жахліва пакалечанай мове, прычым гэта не проста выпадковыя памылкі, а «прынцыповая лінія», бо яна амаль нікольկі не пахіснулася пасля справядлівай крытыкі ў друку. На газеты раўняецца рэдактура і штат стылістаў Беларускага Дзяржвыдавецтва, якія з усяе сілы стараюцца нівеліраваць літаратурную мову, знішчыць усё яе сінанімічнае багацце, вытрусіць з мовы ўсе яе фарбы, ператварыць яе ў штосьці шэрае і невыразнае.

На газеты, нарэшце, раўняецца школа, «на-хаду» уносячы «папраўкі» у правапіс, «выбачліва» трактуючы мову літаратурных твораў, якія вывучаюць вучні.

Мы лічым, што зусім своечасовым будзе ва ўсю шырыню паставіць, абмеркаваць і вырашыць тыя спрэчныя пытанні, якія ёсць у справе афармлення і развіцця беларускай мовы. Час ліквідзіраваць розныя спрэчныя і беспадстаўныя «ссылкі» ў гэтай справе.

Мова нашых мастацкіх твораў і школьных падручнікаў, мова газет і радыёперадач павінна быць мовай адзінай, далейшае развіццё і ўзбагачэнне яе павінна ісці па агульнаму прадуманаму і навукова абгрунтаванаму рэчышчу, якое выключыць усякую магчымасць разнабою, блытаніны і шкоднага саматужніцтва.

Высоўваючы на абмеркаванне ўсе гэтыя пытанні, мы, для сцвярджэння нашай думкі, спынімся на радзе канкрэтных прыкладаў. У якасці матэрыялу мы бярэм мову газеты «Звязда». На яе раўняюцца ўсе нашы газеты. Усё, што ёсць у ёй карыснага і памылковага, аўтаматычна пераносіцца на старонкі іншых газет. Такім чынам, мова «Звязды» у асноўным характарызуе агульнае становішча нашай газетнай мовы.

Мы будзем гаварыць аб тым, што ёсць спрэчнага і памылковага ў мове «Звязды».

Агульнавядома тое, што словы ў мове размяшчаюцца своеасаблівымі гнёздамі, аб'яднанымі агульным коранем, сэнсавай нагрузкай. Механічнае ўнясенне ў мову якога-небудзь слова, блізкага па гучанню, але далёкага па сэнсу ад наяўнага слоўнага гнязда, неадхільна выклікае блытаніну ў сэнсе і значэнні раду слоў. Такое механічнае разбурэнне слоўных гнёзд вельмі часта заўважаецца на старонках «Звязды».

Прыводзім прыклады. Ёсць у беларускай мове такія словы, як **жабрацтва, нястачы**. Ігнарыруючы іх, «Звязда» пачынае пісаць **нішчата**. Адсюль вынікае слова **нішчы** (у сэнсе жабрак). Можна запытацца: як-жа цяпер разумець словы **знішчаць, знішчэнне?** Логіка падказвае— як **обеднять, обеднение**. Вось так пачынаецца блытаніна! Ёсць слова **нягоды**, «Звязда» пачынае пісаць **няўзгоды**. А як цяпер разумець слова **няўзгоднены?** Карыстаючыся словамі **ўлічваць, улічым**, «Звязда» ў той-жа час ужывае слова **учот**. Чаму, калі так лёгка ствараецца і ў мове існуе слова **улік?**

Рашуча выкрываючы слова **шмат** (яно заўсёды заменена словам **многа**), газета, аднак, піша **шматтыражка, шматлікі**. Увёўшы ва ўжыванне слова **таржаство**, газета не змагла стварыць блізкага яму па кораню гнязда слоў і ўжывае адначасова словы **урачысты, урачыста**. Надаючы, відаць, асобнае значэнне слову таржаство і заўважаючы, што газета «Літаратура і мастацтва» не ўжывае яго (дарэчы, слова **чэсць** і вытворныя ад яго — **чэсны, пачэсны** «Літаратура і мастацтва» ўжывае), «Звязда» ў той-жа час старанна абмінае слова **трыумф**, якое можна знайсці ў партыйных дакументах і ў творах класікаў марксізма.

Няўменне адчуць розніцу сэнсу пры блізкасці гучання слоў у родственых мовах відаць з такіх прыкладаў: рускае **свергли** даецца як **звергл**і. Але-ж слоўца «звергл**і**» не з палітычнай галіны, а з... ветэрынарнай. Невядома, чаму забыта слова **нізрынуць**, якое давала-б магчымасць напісаць **нізрынулі**. І зразумела, і правільна. Або **веселие**. Забываюць пра існаванне беларускага **вяселле — свадьба** і пішуць: «вяселле народа прадаўжалася да позняй ночы». Сумны жарт! Не клапоцячыся аб пратакольнай дакладнасці (а яна часцей за ўсё і падводзіць), можна было-б сказаць: «Народ весяліўся да позняй ночы». Рускае **богатырь** даецца як **багатыр**. Але-ж беларускае **багатыр** гэта **—богач**. Слова **шествие** «Звязда» раней перакладала як **шэствіе**, цяпер — **шэства**. Атрымалася нешта штучнае. Трэба было глянуць на народныя словы **нашэсце** і **ўшэсце**, тады знайшлося-б слова **шэсце**.

Утварэнне слоў ад кораня мае пэўныя законы: корань не траціць свайго гучання, асновы. Чаму-ж у «Звяздзе» ад слова **попел** утвараецца **пепельніца?**

У кожным нумары «Звязды» можна знайсці рад прыкладаў простага няведання жывой беларускай мовы, упартага ігнарыравання агульнавядомых слоў. Кожны з маленства ведае слова **лялька (дзіцячая цацка)**, але калі гэтая лялька становіцца атрыбутам тэатральнага паказу, дык паводле «Звязды» гэта будзе не лялькавы тэатр, а **кукальны**. Бяскрыўдная ягада **журавіна**, пра якую і песня жартаўлівая складзена (нават на грамафонную пласцінку запісана і па радыё часта выконваецца), на старонках «Звязды» чамусьці ператвараецца ў **клюкву**.

Так адно за адным, непрадумана і неапраўдана, выносіцца на старонкі «Звязды» цэлая чарада слоў, якімі падмяняюцца масавыя народныя і зразумелыя словы, ствараюцца непатрэбныя сінонімы, а ўрэшце авалоданне беларускай мовай робіцца справай надзвычай складанай, цяжкай і заблытанай. Так з'явіліся **зрэлы, зрэласць** (ёсць у народзе словы спелы, спеласць), **расткі** (парасткі), **здраўствуй** (добры дзень, добры вечар), **сазнанне** (свядомасць), **комната** (пакой), **чулкі** (панчохі), **бутылка** (бутэлька), **вывеска** (шыльда), **прадстаўленне** (уяўленне), **цяготы** (цяжар), **нагрaда** (узнагарода), **качуюць** (вандруюць), **булыжная маставая** (брук), **натраўліваюць** (нацкоўваюць), **упітанасць** (укормленасць), **прымякіць** (ужыць), **пастулак** (учынак). Так ствараюцца такія сказы, як: прыпадняты настрой, раскаленая топка, раскошныя нарады, мноства лішэнняў, безлашадныя сяляне, устанавілі пліткі, прыбягаюць да агітацыі, рабочыя губ, адказваюць узросшым патрабаванням, аццэплітельная сістэма, передачны грамадзянін, любоў да гроба, ветхі домік, пашчолкванне прыбораў, свайныя работы, косачны раскол, у належным відзе, іграць са стрэльбай, шкляны завод, кожзавод.

Такая безуважлівасць да мовы, да слова няўхільна цягне за сабою прыкрую неахайнасць і ў пабудове сказаў, у той рабоце, якая называецца стылістыкай мовы. І тады чытач можа ўбачыць **жахлівыя** рэчы. Ён можа, напрыклад, прачытаць: «ён **ляжаў у непрытомнасці** і патрабаваў неадкладнай дапамогі». Цяжка беднаму чытачу дайсці, як можа **патрабаваць** (паўна, на ўвесь голас!) дапамогі **непрытомны** чалавек. Можна са старонак газеты даведацца, што «будаўнікі **ўпусцілі** (далоў?) шмат важных работ», што «трахома **распаўсюджана»**. Газетнаму работніку і неўцям, што распаўсюджваць можна газеты, кнігі, тавары, а трахома — **пашыраецца**. Чытач чытае пра «урокі, якія **прыпаднесла** Чырвоная Армія». Хацелася сказаць **прэподала**, а выйшла **преподнесла...** А гэта зусім не адно і тое.

Гэта «стылістыка» мовы дапускае і такія дубовыя сказы: «З боку асобных калгаснікаў і аднаасобнікаў мелі месца нядобрасумленныя адносіны да сацыялістычнай уласнасці» (на звычайнай мове гэта было-б сказана так: «Асобныя калгаснікі і аднаасобнікі нядобрасумленна адносіліся да сацыялістычнай уласнасці»), альбо—«будучы закланочаным пытаннем, ён прапанаваў» (у жыцці гавораць: «заклапочаны гэтым, ён прапанаваў»).

Гэта—стылістыка горшага тыпу канцылярыі. Ад яе-ж ідзе і прынцыпозае, заўсёднае **днямі**, замест **гэтымі днямі, надоечы, не так даўно** і г. д.

Дыскусія аб недакладнасцях сучаснага беларускага правапісу, не атрымаўшы пакуль свайго канкрэтнага завяршэння ў выглядзе новага выпраўленага правапісу, мела, аднак, тую папярэднюю карысць, што некаторыя яўна нягодныя правілы правапісу пачалі выпраўляцца проста ў практычнай рабоце. І таму можна было-б толькі вітаць уядзенне «Звяздой» суф'ксальнага «ір», агульнага для беларускай і рускай мовы і выжытага з правапісу нацдэмамі, каб штучна «парадніць» беларускую мову з польскай. «Звязда» пачала пісаць **дэманстрыравалі, дэкламіравалі** і да т. п. Гэта падхапілі газеты, часопісы, суфіксальнае «ір» паявілася і ў творах пісьменнікаў. Раптам «Звязда» амаль поўнасцю адмовілася ад ёй-жа ўведзенага «ір» і цяпер яно трапляецца на старонках газеты вельмі рэдка і мае ўжо выгляд «памылкі друку».

Паспрабавала «Звязда» удакладніць скланенне назоўнікаў, але не прадумала справы да канца і можна цяпер чытаць: скарга—**скарг**, урна—**урнаў**. У якім-жа выпадку правільна?

У артыкулах па пытанню папраўак і змен правапісу аднадушна адзначалася неабходнасць упарадачыць напісанне прозвішчаў,—у гэтым раздзеле правапісу яскрава праявілася паскудная работа нацдэмаў, накіраваная на тое, каб падкрэсліць нацыянальную прыналежнасць, калі прозвішча аднагучна для рускага і беларуса,—маўляў, глядзі, гэта не беларус, а рускі. Наўрад, ці згадзіўся-б хто на такую фармуліроўку гэтага правіла: «рускія прозвішчы з канчаткам **ёв** пішуцца па-беларуску з канчаткам **эў**, прозвішчы з канчаткам **оз** пішуцца па-беларуску з канчаткам **эў** альбо **аў**, прозвішчы з канчаткам **ев** пішуцца па-беларуску з канчаткам **оў**». Смяхотнае мудрагельства — скажа кожны. Аднак... да гэтага «правіла» упарта вядзе практыка «Звязды». На яе старонках **Трубачев** ператвараецца ў **Трубачэў** (тут не хапіла ведання тае простае рэчы, што па-руску гук **ё** ў друку звычайна абазначаецца праз літару **е** без кропак над ёю, а гучыць блізка да **о**), **Булычов**—у **Булычэў** (не толькі не здолелі як належыць прачытаць, а, відаць, і на слых не ўлоўліваюць, хаця гэта прозвішча часта гучыць са сцэны). **Шульгов**—у **Шульгаў, Тимошков**—у **Цімошкаў, Кудрявцев**—у **Кудраўцоў**.

Не цяжка ўпэўніцца, што гучанне прозвішчаў ад такой аперацыі набывае нейкі падкрэслена-здзеклівы характар. А чаму-б не пісаць так, як гучыць: Трубачоў, Булычоў, Цімашкоў, Кудраўцаў? Навошта «арыгінальнічаць»?

Прагненне да выпраўленняў (па сутнасці—скажэнняў) даводзіць да таго, што прозвішчы з яскравым гучаннем кораня (ад пэўных рэчаў) таксама перакрыўляюцца, напрыклад,—Богацель, Трубушаўскі, Качаноўскі. Беларускае прозвішча Шаўчэнка ператвараецца ў Шаўчанка, Саўчанка ў Саўчэнка. Дзеля чаго гэта робіцца?

Возьмем геаграфічныя назвы. Ім таксама не шанцуе, калі яны трапляюць у артыкулы «Звязды». Увесь час пісалася (як і гаворыцца) Мазыр, мазырскі. Цяпер на адной і той-жа старонцы можна прачытаць і так і інакш: Мозыр, мозырскі. Асіпавічы часам пішацца Асіповічы, Магілеў—Магілёў, Ашмяны—Ошмявы. У напісанні геаграфічных назваў заходніх абласцей БССР да гэтага часу не зжыта польская транскрыпцыя: Крулеўшчызна замест Крулеўшчына, Бяла замест Белая, Гарадзей замест Гарадзея, Мала мыш, замест Малая мыш, Батэчкі замест Бацечкі і шмат іншых.

Настойліва прывіваецца напісанне «у Гродна, у Маладзечна, у Вільна» замест «у Гродне, у Маладзечне, у Вільні», як гэта вымаўляецца і як гэта трэба пісаць. Тут пэўна бралася пад увагу тое, што ў рускай транскрыпцыі гэтыя назвы не змяняюцца. І якраз даведзена шкоднасць механічнага, непрадуманага пераймання правілаў. Справа ў тым, што па-руску гэтыя назвы маюць канчатак **о**, які не змяняецца (так, як і ў назвах Кирово, Тосно, Пулково і інш.). Але-ж па-беларуску яны маюць канчатак **а** альбо **я** (Гродна, Маладзечна, Вільня), а назвы з такімі канчаткамі змяняюцца і ў рускай транскрыпцыі (Вязьма—в Вязьме, Одесса— в Одессе, Ельня—в Ельне). Каго-ж тут хацелі перамудрыць работнікі «Звязды»?

Не ўсё добра са скарочанымі словамі. Досыць аднаго прыкладу: пішацца гаркам, але горвыканком, горсовет. Чаму ў адным выпадку **а**, а ў другім — **о**? Загадка...

* *
*

Паколькі шкоднай з'яўляецца арыентацыя на старых «мовазнаўцаў», настолькі-ж шкодным будзе грунтаваць работу на выпадковым саматужніцтве. Справа развіцця і ўзбагачэння беларускай мовы павінна весціся на сур'ёзнай, навуковай аснове. Мы лічым, што гэтай работай павінен кіраваць Інстытут літаратуры і мовы Акадэміі навук БССР. Пры ім павінна быць створана сталая камісія з удзелам не толькі навуковых работнікаў але і практыкаў—пісьменнікаў, журналістаў, актораў, стылістаў выдавецтва, дыктараў Радыёкамітэта. Гэта камісія павінна разглядаць усе спрэчныя пытанні, даваць па іх канчатковыя рашэнні. Яна-ж павінна весці агляд усіх відаў друку, даваць свае аўтарытэтныя рэцэнзіі па мове розных выданняў.

Прадпасылкай для гэтай вялікай і адказнай работы павінна быць ажыўленне ўсёй работы Інстытута. Частка яго работнікаў у артыкулах па пытанню правапісу, імкнучыся даць перспектыву руху наперад, выказала, аднак, рад памылковых думак.

Неабходна ў аснову ўсёй работы па мове пакласці ясныя і дакладныя ўказанні партыі і правадыра народаў таварыша Сталіна.



Кіностудыя «Ленфільм» закончыла вытворчасцю новы гісторыка-рэвалюцыйны фільм «Абарона Петраграда». На здымку: Кадр з фільма. Елпатаў (арт. Віолінаў) скідае ўдарам прыклада ў яр байца Сенюшкіна (арт. Кадачнікаў).

РАДАСЦЬ ВЫЗВАЛЕНАГА НАРОДА

АЛІМПІЯДА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ У БАРАНАВІЧАХ

На сцэну выходзіць 60-гадовы сівабароды дзед. Ён упершыню ў сваім жыцці выступае перад такой вялікай аудыторыяй, яго ўпершыню ў жыцці сустракаюць бурай апладысментаў. Канферансье абвяшчае:

— Селянін з вёскі Несутычы Навагрудскага раёна тав. Остраух прачытае ўласны твор, прысвечаны вызваленню Заходняй Беларусі ад белапалякаў.

І, прыжмурыўшы ад моцнага святла пражэктараў вочы, ахоплены радасным хваляваннем, стары чытае свой верш. Простыя, але шчырыя, ад усяго сэрца словы. Колькі ў іх шчасця, колькі ў іх упэўненасці ў светлай будучыні!

***

У вёсцы Гердаўка (Навагрудскі раён) ведаюць Андрушкевіча, як таленавітага музыканта. Сам ён даўно ўжо іграе на скрыпцы і сыны ўнаследвалі гэты талент.

— Баб такім людзям ды вучыцца, от былі-б музыкі!.. — гаварылі аднасяльчане. Але селянін Андрушкевіч і яго дзеці маглі толькі марыць аб гэтым. І вось, хадзілі яны па хатах, ігралі вяселлі, весялілі вясковых багацеяў. Так было поўгода таму назад, а цяпер сям'я Андрушкевіча ў вялікай пашане.

— «Не для паноў мы іграем, а для сваіх прыяцеляў, і за гэта ўдзячны вам, дарагія таварышы», — гаворыць бацька — кіраўнік музычнага ансамбля. У складзе ансамбля шэсць чалавек, усе яны члены адной сям'і. Самы малодшы з іх, дзевяцігадовы Сяргей, іграе на цымбалах і на гармоніку. Ансамбль выконвае савецкія песні, беларускія народныя песні і танцы.

***

Хор сялян з вёскі Вялікае Палессе (Ляхавіцкі раён) спявае без кіраўніка.

— Хто-ж у вас адказны? — зацікавіліся мы.

— Ды ўсе. Кожны за сябе адказвае, дарагія таварышы.

Сорак чалавек — сорак гучных і бадзёрых галасоў.

— Адкуль гэта ў вас песні такія добрыя? — цікавіцца журы алімпіяды.

— А мы іх самі склалі!

***

Цяпер, відаць, праславіцца вёска Лань (Несвіжскі раён) на ўсю акругу сваімі танцорамі. І сапраўды — колькі бадзёрасці, радасці ў гэтай прыгожай, складанейшай «кадрылі». Спецыялісты-балетмайстры пацiскаюць плячыма, здзіўляюцца майстэрству, тэхніцы ланьскіх танцораў.

— Ну, як? -

— Здорава!

— Вось-бы нам так... А?

Апускаецца заслона, а глядач зноў і зноў выклікае на біс таленавітых выканаўцаў.

***

У першай абласной алімпіядзе прымала ўдзел каля 900 чалавек. Іх таленты ў мінулым гінулі пад панскім ботам, задыхаліся ў цяжкай атмасферы нацыянальнага гнёту, бяспраўя, галечы.

— «Мне выпала цяжкая доля работніцы капіталістычнага прадпрыемства, — гаворыць удзельніца алімпіяды тав. Фрыд, — аб вучобе, аб развіцці сваіх здольнасцей і думаць не прыходзілася. Але настаў вялікі дзень — 17 верасня 1939 года. Забіла крыніцай жыццё вызваленай зямлі».

У горадзе створаны гурткі мастацкай самадзейнасці, якія на алімпіядзе паказалі ўзоры сваёй работы. Заслугоўваюць быць адзначанымі танцавальны калектыў рабочых мясакамбіната, яўрэйскі драмгурток промкааперацыі, танцавальны гурток прафсаюзаў, які стаў любімым гуртком баранавіцкага гледача за добрае выкананне «лявоніхі», і хор пры Доме народнай творчасці (кіраўнік тав. Жыгоцкі).

Харавыя гурткі, паказаныя на алімпіядзе, наогул пакідаюць вельмі добрае ўражанне. Хор з Несвіжа выконваў вясёлыя песні, тэкст і музыка якіх напісаны таленавітым кіраўніком хора тав. Зархі («Савецкія машыны», «Ідзе вясна» і інш.)

З індывідуальных выступленняў нельга не адзначыць віртуоза-акардыяніста тав. Копыця (гор. Несвіж), скрыпача тав. Райдара (гор. Слонім), тав. Ковенскую з Дзятлаўскага раёна, якая па-майстэрску прачытала верш Маякоўскага «Разговор с товарищем Лениным» і інш.

Радасць вызваленага народа, удзячнасць адважным байцам Чырвонай Арміі, падзяка вялікаму правадыру, бацьку і настаўніку таварышу Сталіну за шчаслівае жыццё гучыць у песнях, ззяе ў вясёлым позірку вачэй, звініць на вуснах працоўных, вызваленых з-пад панскага гнёту.

Вялікая, небывалая гэта радасць!

Барыс САВІЧ.

ТРАФАРЭТНАЯ ПАЭЗІЯ

АНАТОЛЬ АСТРЭЙКА «СЛАВА ЖЫЦЦЮ»

Зусім надаўна вышаў з друку зборнік вершаў А. Астрэйкі «Слава жыццю».

Анатоль Астрэйка — здольны малады беларускі паэт, ён прымушае чакаць ад сябе ў далейшым многага. Тым не менш, гэты зборнік вершаў гаворыць далёка не ў яго карысць. Лячыць паспешнасці, недапрацаванасці — агульны прызнак твораў нашай літаратурнай моладзі—ляжыць на большасці вершаў Астрэйкі.

Лічым неабходным спыніцца на вялікай памерам паэме А. Астрэйкі «Героі Хасана». Яна займае палову зборніка. Тав. Астрэйка ўзяўся за грандыёзную тэму, але не змог яе вырашыць. У паэме няма амаль ніводнага свежага, самастойнага вобраза, які-б надоўга застаўся ў памяці чытача. Здаецца, што ўсё гэта даўно прачытана, і нават не ў мастацкіх творах, а ў газетных артыкулах. У паэме няма герояў. Ёсць толькі імёны і прозвішчы са спёртымі, зношанымі азнакамі: «бясстрашны таварыш Лазо»; «адважны лейтэнант Махалін»; «лейтэнант бясстрашны»; «беззаветны воін»; «сні, адважны, беззаветны воін»; «лавіна грозная»; «і з кулямётаў смела і бясстрашна японцаў скошвае герой Рыгор»; «храбры лейтэнант»; «капітан легендарны» і г. д.

Трэба было паказаць герояў так, каб чытач, прачытаўшы твор, сам назваў іх бясстрашнымі, адважнымі, легендарнымі, беззаветнымі. У паэме гэтага няма.

Аднабакова паказаны і ворагі. Сярод іх ні аднаго нармальнага чалавека. Усе яны чамусьці крывыя і сляпыя альбо надслепаватыя: «Лезе, лезе шалёны зброд»; «захопнікаў зброд»; «да граніцы не надыйдзе подлы зброд»; «адкуль узяў адвагу зброд»; «роты зброду»; «самураяў зброд». «Зброд» — больш нічога паэт аб ворагу сказаць не змог. Адчуваецца дзіўляючая беднасць і трафарэтнасць лексікона аўтара.

Паэт стамляе чытача шматлікімі празаізмамі. Ён гаворыць аб камісару Івану Пажарскім:

Ён быў сапраўдны друг і ваенком
З вялікай воляй
І нястомнай сілай.
Любіў ён армію,
Як родны дом,
Як брата, ўсе байцы яго любілі
(стар. 49).

Гэтыя голыя словы пазбаўлены паэтычнага пачуцця і не выклікаюць у чытача ніякага ўражання.

Нават пры беглым чытанні паэмы можна сустрэць безліч недарэчнасцей. Вось некаторыя з іх:

А ля катла,
Дзе аганёк вёў говар (?!),
Суп спрабаваў на смак
Вясёлы повар (стар. 25).

Як можна сказаць: «Мы калацілі іх штыкамі»? (Стар. 36). Альбо: «Бандытам не дамо спагады» (стар. 45). Даўно вядома, што «спагада» — спачуванне, чаму-ж Астрэйка ўжывае яго ў сэнсе «літасць»?

А вось яшчэ:

Рыгора ўчора
Ударыў з-за ўзгорка (?!)
Рантоўна шабляй
Самурай крывы (стар. 56).

Застаецца спытацца, колькі метраў даўжыні павінна была мець гэта шабля, каб афіцэр дастаў Рыгора аж з-за ўзгорка?

У вершах Астрэйкі парушаны самыя элементарныя законы рыфмы і рытму. Вось прыклады рыфмоўкі: крык — палкі; галовы—жывёлы; зайграла — самурая; афіцэра — прыцэла; падпоўз—курок.

Паэма Астрэйкі не пазбаўлена некаторых добрых месц. Асабліва гэта адчуваецца там, дзе Астрэйка закранае прыроду. У апісанні пейзажа адчуваецца штосьці свежае, належачае толькі Астрэйку. Як на прыклад, можна ўказаць на III раздзел I часткі паэмы.

Лепшым раздзелам зборніка з'яўляецца «Слава жыццю». Большасць вершаў тут праснякнута глыбокім лірызмам і цеплынёй. Вершы, стылізаваныя пад узоры народнай паэзіі, удаюцца Астрэйку. Сюды трэба аднесці ўступ да паэмы «Героі Хасана», невялікі, але добры верш «Кагадная», «Жніўную песню». У гэтых вершах паэт успрыняў багатую культуру Купалы і Коласа.

Да ўдалых рэчаў Астрэйкі трэба аднесці вершы «Дуб» і «Камень». Вось пасапраўднаму выразныя паэтычныя радкі:

Вяршыню стромкую сасны,
Калі ўзыходзіў першы золак,
Як асаку каса, сястры[г]
Снарада цяжкага асколак (стар. 102)

Вершы А. Астрэйкі, надрукаваныя за апошні час, сведчаць аб значным росце маладога паэта. Сярод іх трэба асобна выдучыць вершы, прысвечаныя вызваленню Заходняй Беларусі. У іх ужо ёсць уменне паэта будаваць верш на жывых і самастойна заўважаных дэталях рэчаіснасці, — якасць, якая адсутнічае ў кнізе «Слава жыццю».

І. ЛЯНДРЭС.

„БАНДАРОЎНА“

(ДА ПЫТАННЯ АБ ЯЕ ФАЛЬКЛОРНЫХ ВЫТОКАХ)

Аб прыгожай Бандароўне
І аб справах пана
Засталася у народзе
Песня з давен-даўна.

Я. Купала. «Бандароўна».

Са школьных год у нашу свядомасць разам з самымі лепшымі, светлымі вобразамі літаратуры ўвайшоў вобраз Бандароўны. Многае забываецца, але нельга было забыць, як:

Уцякала Бандароўна
Ды паміж платамі,
А за ёю тры гайдукі
З голымі шаблямі.

Тэмай гэтага твора з'яўляецца абарона свабоды індывідуальнага пачуцця ў такім грамадстве, дзе пануе сіла золата. У паэме гэта тэма выражана не пышнымі рытарычнымі фігурамі, а праз канкрэтны, пачуццёвы вобраз. Гэта вырашыла поспех паэмы.

Паэма Я. Купалы «Бандароўна» з'яўляецца вынікам вялікай работы паэта над народнай песняй.

Народная песня аб Бандароўне можа быць па праву названа думай аб гістарычным мінулым народа.

Дзея паэмы адбываецца ў першай чвэрці XVIII стагоддзя. Адчуваючы патрэбу ў рабочай сіле, шляхта абяцаннем розных «свабод» пераманьвае сялян на правы берат Днепра. Але з перасяленнем сялян канчаюцца і абяцаныя «свабоды» ды «ільготы». Сяляне становяцца звычайнымі прыгоннымі «хлопамі». Шляхта сілай навязвае сялянам каталіцызм. Усё гэта выклікала хваляванні сялян і амаль усё XVIII стагоддзе Беларусь і Украіна былі ахоплены полымем сялянскіх паўстанняў.

Асабліва вялікім было паўстанне 1768 года («Каліўшчына») пад кіраўніцтвам Максіма Залізняка, да якога далучыўся уманскі сотнік Іван Гонта. Гэта паўстанне ахапіла Кіеўшчыну, Падолію, Валынь. Рэха яго дакацілася да Галіцыі і Беларусі. Паўстанне ўкраінскіх сялян знайшло гатовую глебу на Беларусі, бо тут у 50—60-я гады XVIII стагоддзя быў моцны паўстанцкі рух супроць польскіх паноў на Мазыршчыне і ў іншых месцах. Вельмі цікавым з'яўляецца той факт, што перад паўстаннем 1768 года на правабярэжнай Украіне, з сяла ў сяло, хадзілі кабзары-лірнікі і спявалі песні, у якіх праслаўляліся народныя героі, барацьбіты за свабоду.

Песні лірнікаў адыгралі ролю ідэалагічнай падрыхтоўкі паўстання 1768 года. Яны будзілі пачуццё нянавісці да польскіх паноў.

Мабыць, гэтымі лірнікамі дзе-небудзь на Валыні і была пакінута песня аб «прыгожай Бандароўне і аб справах пана». А ўжо затым, падхопленая народнымі песнярамі, яна паявілася ў розных кутках Украіны, Польшчы, на поўдні Беларусі (Палессе). Геаграфічнае распаўсюджанне песні паказана ў адным з яе варыянтаў, які расказвае, што Бандарэнка спачатку хадзіў-блудзіў па Валыні, а затым пайшоў на Палессе «панкоў-ляшкоў біці».

Вядомыя нам запісы варыянтаў песні аб Бандароўне, якія мы знаходзім у зборніках Я. Ф. Галавацкага, П. П. Чубінскага, П. В. Шэйна, зроблены на Валыні, у Галіцыі і на Беларусі (Палессе).

У розных варыянтах песні падзеі адбываюцца ў розных месцах: Луцку, Багуславе, Церастэчку, але часцей за ўсё ў мястэчку Берастэчку. У адносінах прозвішча пана варыянты песні не захоўваюць адзінства. У адных песнях гэта пан Хамінскі, у другіх Канюшны, у трэціх Канеўскі. І толькі ў паэме Купалы пан прымае прозвішча Патоцкага, канеўскага пана, імя якога ў народнай творчасці даўно стала сімвалам усяго жорсткага, дзікага і свавольнага.

Падзеі разгортваюцца ва ўсіх варыянтах (з невялікімі разыходжаннямі) аднолькава, пагэтаму мы абмяжуемся тым, што прывядзем варыянт Шэйна, запісаны ім на Валыні:

В славнем месце Берастэчку
канеля грае.
Малодая Бандаровна у корчмы гуляе.
Ой прыехаў пан Канёвскі, добры дзень
всем дав.
Малодую Бандаровну шчэ й
пацелавав.
Малодая Бандаровна шчэ жарты не
знала.
Ударыла ручанькаю да пана зацяла.
Гаварылі стары людзі, гаварылі сцiха:
«Вускай, Бандаровна, будзе табе ліха!»
Уцякала Бандаровна да паміж платамі,
А за нею тры гайдука з голымі
шаблямі.
Узяв на стары жовнер за белую руку,
Прыпроводзів Канёвскому на веліку муку.
— Ой, чы волiш, Бандаровна,
мёду-віна піці.
— Ой, чы волiш, Бандаровна, в сырой
землі гніці?
«Ой, волю я дзесяць раз в сырой
землі гніці,
Неж з табою, мой паночку, да
мёд-віно піці».
А в нашай Бандаровны за касамі
кветкі,
Куды неслі Бандаровну крававы
слезкі.
Ой прынеслі Бандаровну да новыі
хаты.
Палажылі на лаваньцы, сталі ўбірапі.
Ой навілі Бандаровне веночак з
барвенку.
Так убралі Бандаровну, як да шлюбу
дзевку.
Ой прыехав пан Канёвскі дай став
жалковаці:
Харошая дзеўка була, мусіем
страцяці!
Ой казав жа пан Канёвскі атласу
набраці,
Ой казав жа пан Канёвскі музыкі
дастаці
Да маладой Бандаровне да гробу
заграці.
Як жа сталі Бандаровну в земле
апускаці,
Тогда велев пан Канёвскі шчэ
жалобней граці.
Ударывся стары Бондар аб стол
галавою:
«Налажылась, мая донька, за всех
галавою».

Атрымаўшы ад народа песню, Я. Купала адчуў яе паэтычныя магчымасці, адшліфаваў песню і вярнуў народу ў новай якасці.

Параўнанне народнай песні аб Бандароўне з аднайменнай паэмай Я. Купалы паказвае, што перад намі не просты пераказ, а вольная творчая апрацоўка матываў народнай песні.

У народнай песні адсутнічае партрэт Бандароўны. Я. Купала ў духу фальклору малюе Бандароўну:

Як маліны, яе губкі,
А твар, як лілея,
Як дзве зоркі, яе вочы,
Гляне—свет яснее.

Бандароўна выступае перад намі прыгожай дзяўчынай з павабным станам, «уся, як цень, павеўна». Яна бесклапотна вяселіцца з маладымі казакамі.

І вось Бандароўну злавілі і прывялі да пана.

І стаіць яна прад панам,
Як калінка тая,
Што у лузе, над ракою
Вецер пахіляе.

І варта толькі нянавіснаму пану выступіць з сваёй ганебнай прапановай, як адразу змяняецца вобліх Бандароўны («затраслося пямстай сэрца», «спахмурнелі чорны бровы», «заіскрыліся вочы»).

Перад панам тым з Канева
Смела дзеўка стала,
Смела гледзячы у вочы,
Смела адказала.

Частата паўз, перарываючых апавяданне на кароткія адрэзкі, надае мове паэмы трывожны і напружаны характар. Гэта эмацыянальнасць у паэме дасягаецца і паўтарэннем асобных слоў з поўным гукавым комплексам. Напрыклад:

ЖУдка, жУдка, дым пажарны
БУхае унОчы.
А жудчэй яшчэ у пана
Задымелі вочы.

Калі мы гаворым аб падкрэсленай эмацыянальнасці паэмы Я. Купалы, то гэта зусім не азначае, што народная песня аб Бандароўне пазбаўлена эмацыянальнага гучання.

Справа ў тым, што народная песня спявалася лірнікам, які ў вуснай перадачы аздабляў звычайныя словы сваім пачуццём. І вядома, што для слухачоў песня не здавалася аднатоннай. Гэту эмацыянальнасць народная песня ў значнай меры не страціла нават і ў пісьмовай перадачы.

Купала ў сваёй паэме ўзмацняе драматызм і эмацыянальнасць народнай песні.

Адным з сродкаў гэтага ўзмацнення з'яўляецца выступленне самога паэта, які прасцерагае дзяўчыну, што за ёй вораг сочыць, альбо шле праклён пану.

Пры параўнанні паэмы з народнай песняй адразу кідаецца ў вочы тое, што Я. Купала завастрыў змест песні ў сацыяльных адносінах. Гэта звязана з адной акалічнасцю, якая не можа не быць прынята пад увагу.

Я. Купала не ўспрыняў песню аб Бандароўне, як песню выключна гістарычную, апяваючую далёкае мінулае. Каб не заўвага паэта, што гэтыя падзеі вядомы з давен-даўна, мы-б не маглі сказаць, калі здарылася гэта гісторыя: у XVIII ці XIX стагоддзі. І гэта не страта пачуцця гістарычнага, а зусім свядомы творчы акт. Жывымі яшчэ былі латомкі Патоцкага, якія здзекваліся з народа.

У паэме Купалы падзеі набывалі зусім актуальны характар. У народнай песні тое, што адбылося з Бандароўнай, выступае ў значнай меры, як здарэнне, як трагічны выпадак. У паэме Я. Купалы канфлікт паміж панам і Бандароўнай вырастае ў канфлікт паміж панамі і ўсім народам.

Бандароўна выступае смела супроць пана, таму што за ёю праўда, народ, які гатоў абараняць ад паноў сваё сумленне, сваю свабоду.

І здарэнне з Бандароўнай — толькі адно з праяўленняў агульнай супярэчнасці паміж сялянамі і панамі.

Паводле народнага падання, забойства панам Бандароўны ператварылася ў повад для аднаго з сялянскіх паўстанняў XVIII стагоддзя на Украіне, на чале якога стаў Бандарэнка. Аднак, гэта не знайшло свайго адлюстравання ў народнай песні, якая звычайна канчаецца плачам бацькі: «налажыла, мая доня, за ўсіх галавою».

Гэта месца прыведзена і ў паэме, аднак ім Я. Купала не заканчвае апавяданне. Паэма, у адпаведнасці з паданнем, канчаецца яркім малюнкам народнага паўстання, якім народ адказаў панам на забойства сваёй дачкі.

Цяжка пераацаніць значэнне паэмы «Бандароўна» у творчай біяграфіі Я. Купалы.

А. М. Горкі цаніў больш за ўсё фальклор за яго здольнасць развіваць актыўныя адносіны да рэчаіснасці, напаўняць творчасць «пафасам, агнём, іроніяй».

Народная песня дала магчымасць Я. Купалу стварыць паэму, прасякнутую глыбокім паэтычным пафасам, пафасам велізарнай любві да народа і непрымірымай нянавісці да паноў-прыгнятальнікаў.

М. СМОЛКІН.



Начальнік Управлення па справах мастацтваў пры СНК БССР тав. Озірскі Абрам Барысавіч вылучан кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Віленскай выбарчай акрузе № 422. На здымку: А. Б. Озірскі.

НАРЫС АБ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАХ

Гісторыка-тэарэтычнай кафедрай кансерваторыі БССР падрыхтаван першы ў БССР нарыс аб творчасці беларускіх кампазітараў, які з'яўляецца пачаткам вялікай працы аб беларускай музычнай культуры.

У нарысе — біяграфічныя даныя аб беларускіх кампазітарах, апісанні найбольш выдатных музычных твораў і характарыстыкі творчасці кампазітараў.

Нарыс складзен педагогамі тт. Зінчуком, Карповічам, Аладавым, Смольскім і Мухарынскай.

Нарыс з'явіцца дапаможнікам для музычных і навучальных устаноў, а таксама паслужыць матэрыялам для «Гісторыі музыкі СССР», якая падрыхтоўваецца да друку Камітэтам па справах мастацтваў пры СНК СССР.

У БЕЛАСТОКУ

Пісьменнікі Беластока ўключыліся ў выбарчую кампанію па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Напісаны нарысы, вершы.

Днямі польскія пісьменнікі тт. Панскі, Бранеўская, Сельм і іншыя правялі літаратурны вечар сярод выбаршчыкаў.

10 сакавіка 1940 года ў беластоцкім Доме партактыва адбыўся літаратурны вечар з удзелам пісьменнікаў Пятруся Глебкі, Філіпа Пестрака, В. Вольскага, А. Якімовіча.

Група беларускіх, яўрэйскіх і польскіх паэтаў гор. Беластока піша калектыўную паэму, прысвечаную Сталінскай Канстытуцыі і вызваленню Заходняй Беларусі.

МУЗФОНД БССР

Пры саюзе совецкіх кампазітараў БССР створан Музфонд. У задачу Музфонда ўваходзіць садзейнічанне творчасці і паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў кампазітараў, а таксама сталая матэрыяльная дапамога пачынаючым кампазітарам.

Старшынёй Музфонда БССР выбран кампазітар Н. Аладаў.

ХРОНІКА

П'еса беларускага драматурга В. Вольскага «Дзед і жораў» прынята да пастаноўкі Казахскім дзяржаўным тэатрам лялек у гор. Алма-Аце.

Прэм'ера адбудзецца ў сакавіку месяцы.

М. ЛЫНЬКОЎ

СХОД

УРЫВАК З АПАВЯДАННЯ «КАПЛЯ МАЛАКА»

Сход быў у самым разгары. Упершыню ў жыцці сваім рабочыя вырашалі свае справы, самі вырашалі. Кожны з іх лічыў сваім абавязкам сказаць пра гэта. Некаторыя жанчыны-работніцы, што былі на сходзе, нават усплакнулі, калі слухалі словы таварышоў, якія толькі-толькі вярнуліся з Картуз-Бярозы. Былі яны, гэтыя людзі, што вызваліліся з няволі, худымі, абшэртымі, бяссільнымі. І калі гаварыў каторы з іх, то здавалася, яму нехапае паветра, чалавек натужана падбірае словы, глытае іх, марудна ўспамінае, трывожачы аслабелую сваю памяць. Адзін з іх так проста і сказаў:

— Мы вучымся яшчэ дыхаць пасапраўднаму...

І многія рабочыя сканфужана расцёрлі ў пальцах недакураныя папяросы, вінавата пагледзелі адзін на другога. Тыя, што былі ля дзвярэй, адчынілі іх, — было дужа накурана.

У гэтым дыме ўзнімаўся над сталом узлахмачаная постаць пажылога чалавека. То быў Францаў сваяк, колішні рабочы Мацюш, які таксама прыехаў з картузбярозскага лагера. Ён патрасаў над сталом скрываўленым кастылём і, захлынаючыся словамі, гаварыў:

— Гэта ўсё, чым адарыла мяне маці айчына, калі калені мае разбілі аб цаментную падлогу турмы... Мне сказалі там: ты не будзеш, брадзяга, больш бегаць па вёсках ды па гарадах, ты будзеш прыкуты да зямлі, ты палюбіш зямлю сваёй айчыны, у цябе будзе шмат часу падумаць аб гэтым... І я думаў, таварышы... Я шмат думаў... Чалавечага сэрца не разаб'еш ні цаментнай падлогай, ні тымі дарожкамі цагляным, ці як звалі яны—чырвонымі дарожкамі, якімі катавалі яны нас, камуністаў. Я люблю зямлю сваю, я люблю народ свой... І не таму, што ў мяне перабітыя калені... Я люблю свабодную зямлю, люблю свабодны народ... Люблю людзей, якія зрабілі нас свабоднымі. Цяпер мы будзем жыць, таварышы... І я... А каб добра жыць, вымяцем начыста ўсю поскудзь, што круціцца пад нагамі... Гэтай поскудзі, як відаць, яшчэ хапае ў нас...

Стары Франц уважліва ўслухоўваўся ў кожнае Мацюшова слова. Яму было шкада Мацюша, дужа шкада. Ужо вельмі нескладанае жыццё было ў яго сваяка. Вельмі калючым ён быў, не ўмеў спакойна жыць, не ўмеў ладзіць з людзьмі, ну, з начальствам там... І яго скублі ўсе, як той гарох пры дарозе. А за колькі месяцаў перад вайной Мацюша ўзялі ў турму, адтуль у лагер. Не салодкае жыццё было Мацюшовым дзецям, хапілі ўсяго за гэтыя месяцы. Ды і раней хапала, ніколі не бачылі хлеба ўволю. Адно, што рады былі сонцу ўлетку, то грыб там, то ягадзіны, так і жывіліся. Мо і яны, рабочыя, чым-небудзь вінаватыя перад імі праз гэтае праклятае жыццё... Але-ж яны дапамагалі, чым маглі, дзецям яго... Дапамагалі ўпотай, каб не ўбачыла злое вока...

Дужа шкада Францу Мацюша. Аж падкатваецца нібы камяк які пад самае горла, перціць там Франц папрасіў гальштук — завязаў сёння, каб ісці на гэты першы сход. Сур'ёзна і важна прагаласаваў за Мацюшову кандыдатуру ў рабочы камітэт. І ўсё згаджаўся сам з сабой:

— Канешне, Мацюшу тут месца... Каб толькі не лаяўся ён больш з людзьмі, а жытку рабочую ён ведае, ох як ведае...

Ён згаджаўся сам з сабою, галасаваў за другіх кандыдатаў, усе былі сапраўды слаўныя людзі. Тут быў і канцелярычык Ёсіп, і майстар Бромін, хіба вось толькі, што яўрэй... аднак, ён добры чалавек. І канторшчык Вацэк, таксама талковы, хоць і малады яшчэ чалавек... Уважылі і старэйшых, гэта добра... І тут раптам прахапіўся стары Франц. Выходзіць, ён ледзь не празяваў такой важнай справы. Добрае дзела, ды каб без начальства. Галасавалі апошніх кандыдатаў. Франц намагаўся ўсё сказаць пра свае думкі, але ніяк не адважваўся. Але тут проста запыталі, хто мае яшчэ прапановы аб людзях у камітэт. Франц узяў слова і сказаў яго рашуча, цвёрда:

— Мы, таварышы, зусім забыліся ўвесці ў камітэт пана дырэктара...

У канторы, дзе адбываўся сход, адразу прыціхлі, але на адну хвіліну. Пачулася разам некалькі галасоў:

— Нам не трэба дырэктара ў камітэт... Ён інжынер і добры інжынер, няхай сабе працуе інжынерам, дырэктарам...

Нехта яшчэ дадаў:

— Ён-жа мае акцыі... Ён-жа амаль што гаспадар... Куды-ж яго ў камітэт?

— Ну, што-ж, што акцыі... — не ўнімаўся стары Франц, хоць у голасе і не было ўжо ніякай упэўненасці, ні настойлівасці. — Падумаеш, акцыі... Яны-ж былі дазволены законам, гэтыя акцыі. І зноў, якая нам справа да таго, калі гаспадары завода дазволілі яму мець гэтыя акцыі. А чалавек ён палітычны.

— Ведаем! Пепеэсавец...

— Адукаваны...

— Ведаем!

— Знае сваю справу...

— Ведаем...

— Ён-жа так стараўся аб рабочых, заўсёды клапаціўся аб іх...

— Ведаем! не трэба нам дырэктара ў камітэт...

Стары Франц зусім разгубіўся і перапуча пераменаўся з нагі на нагу. Ён хацеў яшчэ нешта сказаць, але тут папікодзіў яму Мацюш. Той голасна, на ўсю кантору, павітаўся з ім:

— Я і не бачу цябе з-за дыму, стары мой Франпу... Аднак, я дзіўлюся на цябе. Няўжо ты хочаш, каб мы па-ранейшаму цалавалі ручку пану дырэктару?..

— Што ты гаворыш, пане Мацюш? Ён-жа не такі чалавек, каб дазволіць рабочаму цалаваць сабе рукі...

— Ты не зусім мяне разумееш, мой Франц... Справа не ў адных руках... Нічому ты не навучыўся, Франц, за сваё жыццё...

Франц зусім сканфузіўся і, не ведаючы, што рабіць, заняўся сваёй папяросай. Рвалася папера, прасыпалася махорка праз пальцы, і Франц бурчаў сабе пад нос:

— То-ж знойдзе бог пакуту на чалавека...

Сяк-так расталіўшы папяросу, ён усхвалявана пыхкаў ёю, думаючы ўсё пра гэтага Мацюша. І харошы, здаецца, чалавек, але-ж вось возьме і скажа табе прыкрасць якую проста ў вочы. То-ж язык у чалавека, не язык, а пакута, даруй ты божа. Дзіва то, колькі ён, Мацюш, напрыеўся праз гэты язык.

Тым часам людзі паздраўлялі першы рабочы камітэт і сабіраліся ўжо разыходзіцца па хатах. І тут здарыліся зусім непрадбачаныя падзеі. Толькі гэта пасунуліся людзі да дзвярэй, як за вакном бліснула нібы маланка — аж пацямнела было ў канторы, хоць і гарэла лямпа на стале. Праўда, яна мірганула была, жоўтае полымя яе выцягнулася на якую секунду ў трубку і закапціла чыстае шкло. Аб лямпе гэтай казалі людзі пасля ўжо, калі заціхлі ўсе падзеі гэтае ночы. І калі пацямнела на якую секунду ў канторы, за вакном раздаўся страшэнны выбух, і нібы буйны віхар уварваўся ў канторку праз вакно—ураз павылятала ўсе шыбы. Віхар быў такі моцны, што ў некаторых людзей, што стаялі бліжэй да вакна, ветрам пазрывала шапкі з галоў ды пасыпаўся з даху са шкробатам — чулі то ўсе — усякі друзг. Відаць, накідалі дзеці, гуляючы, каменьчыкаў на дах, і яны ляцелі, асыпаліся, гэтыя каменьчыкі, далоў. Усе кінуліся на вуліцу. Некаторыя пабеглі пад вакно —пагледзець, што там здарылася такое. Было цёмна, нічога нельга было разгледзець. Мухін паслаў за ліхтаром. І калі прынеслі яго, усе ўбачылі, што пад самым вакном вышчэрблена сцяна тым, з невядомай прычыны, выбухам. У развароченым доле валяліся павыбіваныя цагліны, кавалкі старога тынку. Чырвонаармейцы, аглядаўшыя зямлю навокал, прынеслі Мухіну невялічкую хусцінку-насоўку.

— Знайшлі тут, недалёчка...

Мухін зірнуў на яе, палажыў у кішэню. Ён пазнаў яе, гэтую хусцінку.

Калі адыходзілі ўсе ад сцяны, пачуўся поблізу чалавечы стогн. Праз якую хвіліну ледзь не наступілі на чалавека. То была жанчына. Яна скурчылася на зямлі, ускудлачаныя валасы — хустка з'ехала зусім—выбіваліся з-пад пальцаў рук, апчаперыўшых галаву. Па пальцах цякла кроў.

— Да доктара!—скамандаваў Мухін. — Аднак, пачакайце, я сам... — і ўзяўшы двух чырвонаармейцаў, ён хутка пайшоў з імі ад канторы.

Жанчына ціха стагнала на зямлі. Яна пачула, відаць, людзей, і праз стогны можна было ўчуць некаторыя словы, якія вытаварвала яна з вялікай цяжкасцю:

— Ратуйце-ж мяне... Ах, што-ж гэта робіцца...

Стары Франц, які стаяў за людзьмі. — Ён-жа так баяўся чалавечай крыві, — раптам ускрыкнуў нема, кінуўся наперад, шалёна рассоўваючы ўсіх, хто быў на яго дарозе, упаў на калені, закрануўся абоімі рукамі да твару жанчыны, павярнуў яго да сябе.

— Што здарылася з табой, мая жонка?!

Ціха, у здзіўленні, загаварылі між сабой людзі.

Адказны рэдактар **І. Д. ГУРСКІ.**

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25 394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Г—1370